

ЧЫМ ПРЫВАБЛІВАЕ БРІКС?

4

ФЛЭШМОБ МІЖНАРОДНАГА МАШТАБУ

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ВЕРАСНЯ 2024 г. СУБОТА № 180 (30314)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Віктар ХРЭНІН, міністр абароны Рэспублікі Беларусь (на 11-м Пекінскім Сяншаньскім форуме):**

*«Дэвіз «Час выбраў нас!», абвешчаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам і Усебеларускім народным сходам, аптымальна падыходзіць на ролю сігналу да пачатку нашай сумеснай работы ў сферы міжнароднай бяспекі. Беларуская дзяржава гатова актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні справядлівага і ўстойлівага свету будучыні ўжо сёння. Заклікаем усе зацікаўленыя дзяржавы далучыцца да гэтага гістарычнага працэсу».*

# СА СВЯТАМ, РОДНАЯ СТАЛІЦА!

## Мінск адзначае чарговы дзень нараджэння



КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўчай прамысловасці з прафесійным святам.**
- Другая сесія Савета Рэспублікі восьмага склікання пачне работу 17 верасня. Адкрыццё сесіі запланавана на 13.00.
- **Каля 170 маладых мытнікаў Беларусі прынялі прысягу ў Брэсцкай крэпасці.**
- Дзве ўнікальныя аперацыі на «забытым клапане» сэрца правялі ў Беларусі.
- **Рэкордная нават для даковіднага перыяду колькасць турыстаў з Узбекістана наведала Беларусь у 2023 годзе.**
- Беларусь дамовілася аб пастаўках тарфяной прадукцыі ў Маскоўскую і Варонежскую вобласць.

ISSN 1990 — 763X

24180

9 771990 763008

Сезонны клопат

## РАМОНТ КАТЛОЎ, ЗАМЕНА СЕТАК І ЗАПАС ПАЛІВА

**У нашай краіне ўжо афармлена 98 % пашпартоў гатоўнасці на цеплавыя крыніцы аб'ектаў ЖКГ. Пра гэта распавёў намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі — начальнік аддзела энергетыкі і надзвычайных сітуацый Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксей ФІЛАНОВІЧ.**

У прыватнасці, ён адзначыў, што пры падрыхтоўцы аб'ектаў ЖКГ да работы ў асенне-зімовы перыяд жыллёва-камунальная гаспадарка ажыццяўляе штотыднёвы кантроль па 13 асноўных паказчыках.

З асноўных — гэта замена і капітальны рамонт катлоў, замена цеплавых сетак, стварэнне запасаў драўнянага паліва. Таксама немалаважным з'яўляецца прафесійны рамонт сістэм ацяплення жылых дамоў, цеплавых пунктаў, рамонт стыкаў сценавых панэляў і іншыя. Спецыяліст падкрэсліў: штомесячны кантроль вядзецца па 89 паказчыках — прафагляд, прафрамонт водаправодных, каналізацыйных сетак, збудаванняў на іх, рамонт электраабсталявання, рамонт і праверка пячнога ацяплення ў жылых дамах, праверка прыбораў уліку. Усе гэтыя мерапрыемствы гарантуюць надзейнае і бесперабойнае і безаварыйнае цеплавое водазабеспячэнне жыллёвага фонду, а таксама забеспячэнне ўсёй інфраструктуры гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў у ацяпляльны перыяд.

СТАР. 3

На ўласныя вочы

## Манга і маракуя на ўласных сотках

**Навошта навукоўцы вывучаюць трапічныя культуры?**

**У вялікай цяпліцы побач з доследным вінаграднікам Інстытута пладаводства лунае духмянаваты, салодкі водар. «Гэта цвіце маракуя, так пахнуць яе кветкі, — тлумачыць навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Уладзімір УСЦІНАЎ. — Да кастрычніка, спадзяёмся, саспеюць плады».**



Фота Лізаветы ГОЛАД

Вывучэннем раслін трапічнага кірунку беларускія вучоныя зацікавіліся некалькі гадоў таму. А саму ідэю запазычалі ў аматараў-энтузіястаў, з якімі трымаюць пастаянную сувязь. Вырасцілі з насення экзотаў ужо нашы, беларускія расліны. Некалькі гадоў тыя цвілі, але не пладаносілі, а сёлета далі першыя плады.

СТАР. 7

З першых вуснаў

# «БЕЛАРУСЬ ЗАЎСЁДЫ БЫЛА НАДЗЕЙНЫМ ПАРТНЁРАМ ІРАНА»

## Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу з сакратаром Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі Ірана

**Іранская дэлегацыя на чале з Алі Акбарам Ахмадзіанам прыбыла ў Беларусь з Расійскай Федэрацыі пасля завяршэння ўдзелу ў сустрэчы высокіх прадстаўнікоў, якія курыруюць пытанні бяспекі, дзяржаў БРІКС. Вітаючы госця Палаца Незалежнасці, Аляксандр Лукашэнка выказаў сакратару Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі Ірана ўдзячнасць за тое, што ён знайшоў час прыехаць у нашу краіну і пазнаёміцца з сучаснай Беларуссю.**

### «Мы апынуліся ў адной лодцы і абсалютна не шкадуем аб гэтым»

«Ваш візіт яшчэ важны таму, што воляю лёсу, можа быць, як вы кажаце, ад Алаха гэта ўсё ідзе, мы апынуліся ў адной лодцы і абсалютна не шкадуем аб гэтым, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Нас спрабуюць абылгаць у сродках масавай інфармацыі. Мы гэта разумеем, мы людзі вопытныя: ідзе інфармацыйнае супрацьборства, можа быць, нават з элементамі інфармацыйных войн». Тым не менш, і санкцыі, і іншы ціск, па словах Прэзідэнта, мы пакуль вытрымліваем.

«У час вострай ваенна-палітычнай абстаноўкі і на Блізкім Усходзе, і каля граніц Беларусі, у гэтым еўрапейскім рэгіёне (а вы сур'ёзна ўцягнуты ў канфлікт на Блізкім Усходзе), нам не проста кансультацыі патрэбны — нам патрэбны сумесныя дзеянні з вашай краінай, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы рухаемся да шматпалярнага свету. Гэта будзе вельмі няпросты шлях і, на наша шчасце, і ў Іране, і ў іншых краінах гэта добра разумеюць. Вельмі сур'ёзна набіраюць абароты такія новыя арганізацыі, як БРІКС, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, паўнапраўнымі членамі якой мы нядаўна сталі». У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Ірану за каласальную падтрымку, якая была аказана Беларусі пры ўступленні ў ШАС.

«У гэтай складанай сітуацыі супрацьстаяння на першы план выходзяць пытанні бяспекі, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Але, пагадзіцеся, бяспека будзе тады эфектыўнай, калі працуе эканоміка, калі паміж краінамі гандлёва-эканамічныя адносіны вельмі сур'ёзныя і дынамічна развіваюцца. Мы бачым пастаянны прырост гандлю паміж дзвюма краінамі і, самае галоўнае — нам не дапусціць запаволення ў гандлёва-эканамічных адносінах, бо гэта аснова, гэта фундамент нашых дзеянняў, нашых узаемаадносін».

### «Забароненых тэм паміж намі няма»

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што іранскі народ зусім нядаўна перажыў вялікае няшчасце — у маі ў авіякатастрофе загінуў папярэдні Прэзідэнт Ірана Ібрахім Раісі. «Але вы мужна прайшлі гэты перыяд, вы выбралі новага Прэзідэнта (у ліпені ў прэзідэнцкіх выбарах перамог Масуд Пезешкіян. — **«Зв».**), — канстатаваў беларускі лідар. — Я вас віншую з гэтым. І хачу, каб вы перадалі вашаму Прэзідэнту, што мы чакаем яго ў Беларусі. Калі вы прымеце рашэнне аб візіце Прэзідэнта Ірана ў Беларусь, нам трэба вельмі сур'ёзна падрыхтавацца да гэтага візіту па ўсіх кірунках: і эканоміка, і гандлёва-эканамічныя адносіны, і бяспека, і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Забароненых тэм, як я разумею, паміж намі няма. Галоўнае, спадар сакратар, я хачу, каб вы разумелі: Беларусь заўсёды была надзейным партнёрам Ірана, і мы гатовы годна прайсці свой шлях».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў сакратара Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі Ірана перадаць самыя цёплыя прывітанні і Вярхоўнаму лідару Ірана Алі Хаменеі. «Мы вельмі даўнія сябры і добра знаёмыя з ім, прытым шмат-шмат гадоў», — удакладніў Прэзідэнт.

У сваю чаргу сакратар Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі Ірана адзначыў, што вельмі рады сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы. Алі Акбар Ахмадзіан перадаў Аляксандру Лукашэнку цёплыя прывітанні ад Вярхоўнага лідара Ірана, а таксама Прэзідэнта краіны. «Я вывучыў гісторыю вашых сустрэч з іранскім кіраўніцтвам у ходзе вашага візіту ў Іран або калі наша дэлегацыя наведвала вашу краіну, а таксама вашу сустрэчу з духоўным лідарам Ірана, якія рэкамендацыі пасля вашай сустрэчы духоўны лідар даў іранскаму кіраўніцтву, — расказаў ён. — Таксама хацеў бы выказаць словы ўдзячнасці за ўдзел вашай дэлегацыі ў цырымоніі інаўгурацыі новага Прэзідэнта і спачуванне па прычыне смерці нашага Прэзідэнта».

У размове з журналістамі Алі Акбар Ахмадзіян адзначыў, што Іран і Беларусь заўсёды былі сябрамі. «Нашы адносіны ўжо блізкія да саюзніцкіх, — падкрэсліў ён. — Шматпаважаны Прэзідэнт у ходзе сустрэчы падкрэсліваў неабходнасць працягу і нарошчвання гэтых адносін. Мы ўбачылі яго сур'ёзныя намеры рэзка развіваць нашы адносіны. Убачыўшы гэта, мы пераканаліся, што нашы адносіны з Беларуссю ў будучыні вельмі рэзка павысяцца».

**Вераніка КАНЮТА.**

Блізкая ўлада

# «Пытанні, якія можна вырашаць на месцы, вырашаюцца»

## Ігар СЕРГЯЕНКА правёў асабісты прыём грамадзян і юрыдычных асоб у Браслаўскім раённым выканаўчым камітэце

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў у размове з журналістамі адзначыў, што людзі прыйшлі з рознымі пытаннямі. Рашэнне значнай іх часткі знаходзіцца ў плоскасці мясцовай улады, якая, па словах упаўнаважанага прадстаўніка Прэзідэнта ў Віцебскай вобласці, у прынцыпе з гэтымі пытаннямі дастаткова паспяхова спраўляецца.**

«Некаторыя людзі прыйшлі першы раз, не звяртаючыся раней у райвыканкам, — удакладніў Ігар Сергяенка. — Адразу на месцы было растлумачана, што кіраўніцтва гатова разгледзець пытанні, якія датычацца зямлі, узаемаадносін паміж суседзямі, якія пражываюць на суседніх участках».

Абагульняючы пытанні, з якімі грамадзяне прыходзілі і сёння, і раней у іншых рэгіёнах, Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што шэраг з іх з-за розных прычын, у тым ліку, магчыма, і з-за недастатковасці фінансавання, можа вырашыцца толькі на абласным і рэспубліканскім узроўнях.

Так, прагучала тэма, звязаная з функцыянаваннем сотавай сувязі. Гэтым пытаннем Палата прадстаўнікоў займалася дэталёва ва ўсіх рэгіёнах краіны сёлета. Поўная праграма распрацавана Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі. Па словах спікера, у гэтым і наступным гадах будзе нарошчвацца колькасць вышак сотавай сувязі. Характэрна для вобласці і пытанне якасці вады, адзначыў Ігар Сергяенка, нагадаўшы аб рэалізацыі праграмы «Чыстая вада».



Фота БелТА.

Размова ідзе аб установцы станцый абезжалезвання, што патрабуе дадатковага фінансавання.

Паводле яго слоў, ад грамадзян таксама паступаюць пытанні, звязаныя з павелічэннем электраспажывання ў бытавых мэтах. «Гэта таксама аднамомантна не вырашыш, тым больш што з улікам мінулага ўрагану вялікія задачы пастаўлены кіраўніком дзяржавы ў цэлым па пераглядзе ліній электраперадачы, па абнаўленні, узмацненні канкрэтных аб'ектаў, — нагадаў ён. — Гэта тое, што будзе рэалізоўвацца ў найбліжэйшы час».

Грамадзяне задаюць пытанні (і для Віцебскай вобласці яны характэрны), звязаныя з работай грамадскага міжгароднягa транспарту. Людзі скардзяцца на недастатковасць маршрутаў, састарэлы рухомы аўтатранспарт.

Таксама на прыём грамадзян звярнуўся былы воін-афганец, які на працягу доўгага перыяду не ведаў аб тым, што можа звярнуцца ў органы сацыяльнай абароны насельніцтва па атрыманне надбаўкі да пенсіі. Сёння ён гэту надбаўку атрымлівае, але ставіць пытанне аб тым, каб яму пакрылі выплаты за ўвесь мінулы перыяд. Ігар Сяргеенка ўпэўнены, што такая сітуацыя сведчыць аб недапрацоўках тых людзей, якія павінны непасрэдна гэтым займацца.

«У цэлым пытанні, якія можна вырашаць канкрэтна тут, на месцы, не выносячы на ўзровень рэспубліканскі, абласны, вырашаюцца, і пра гэта гавораць нават лічбы, — заўважыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мінулы раз, калі я прыязджаў, у два з лішнім разы было больш наведвальнікаў».

Разам з тым, заўважыў спікер, ёсць катэгорыя грамадзян, якія хочуць вырашыць сітуацыю на іх карысць, нават калі гэта супярэчыць закону. Гэтыя гісторыі могуць цягнуцца гадамі, людзі звяртаюцца да розных кіраўнікоў з адным і тым жа пытаннем. «Даводзіцца чарговы раз тлумачыць, пераконваць, але гэта таксама неабходна рабіць, каб здымаць напружанасць», — сказаў на заканчэнне Ігар Сергяенка.

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі павысяць пенсіённы ўзрост



Пастаянны камітэт Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў адобрыў план паэтапнага павышэння пенсіённага ўзросту з 1 студзеня 2025 года. Пра гэта гаворыцца ў дакуменце, які распаўсюджаны вышэйшым заканадаўчым органам, перадае ТАСС. Так, устаноўлены ўзрост выхаду на пенсію мужчын будзе паступова павышаны з 60 да 63 гадоў, а жанчын — з 50 да 55 гадоў — для рабочых прафесій і з 55 да 58 гадоў — для дзяржслужачых. Як удакладняецца, такая мера закліканa забяспечыць «адаптацыю да новай сітуацыі ў дэмаграфічным развіцці Кітая». Урад КНР з 1970-х гадоў праводзіў палітыку «адна сям'я — адно дзіця», аднак з-за імклівага падзення нараджальнасці і старэння насельніцтва ўлады апошнім часам былі вымушаны паслабіць абмежаванні. У 2022-м колькасць жыхароў у краіне пачала скарачацца ўпершыню за апошнія шэсць дзесяцігоддзяў. Згодна з афіцыйным прагнозам, доля грамадзян ва ўзросце больш за 60 гадоў у Кітаі да 2035 года перавысіць 30 працэнтаў.

### Прэзідэнт Сенегала распусціў парламент і прызначыў выбары на 17 лістапада



Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву прэзідэнта Басіру Дыямай Фай у звароце да нацыі, які транслiравалі вядучыя тэлеканалы і парталы навін рэспублікі. Па ацэнцы прэзідэнта, апазіцыя ў Нацыянальнай асамблеі (аднапалатны парламент) тармозіць працэс рэфармавання краіны. 3 верасня парламент адхіліў прадстаўлены прэзідэнтам праект закона, накіраванага на рэформу структуры дзяржаўнай улады. Каментуючы гэты крок, Фай заявіў, што дэпутаты прадэманстравалі наяўнасць глыбокага разрыву паміж пазіцыяй парламенцкай большасці і спадзяваннямі народа, выяўленымі падчас прэзідэнцкіх выбараў у сакавіку. Дэпутаты распушчанага складу парламента былі прыведзены да прысягі ў верасні 2022 года. Большасць у Нацыянальнай асамблеі кантралявалі прыхільнікі былога прэзідэнта Сенегала Макі Саля. Канстытуцыя дае магчымасць кіраўніку дзяржавы распускаць парламент пасля заканчэння першых двух гадоў яго работы.

### Немаўлятам пагражае невядомая «супербактэрыя»



Малавывучаная «супербактэрыя», якая выклікае сепсіс у нованароджаных, часцей стала сустракацца ў неанатальных аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі па ўсім свеце. Аб гэтым паведаміла выданне Politico. «Існуе «супербактэрыя», пра якую не ведаюць людзі, і яна выклікае распаўсюджванне інфекцыі ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі немаўлят», — распавёў Марк Уэбер, навуковы супрацоўнік даследчага цэнтра Quadram Institute у Вялікабрытаніі. Паводле інфармацыі выдання, упершыню бактэрыя была знойдзена ў Францыі каля 10 гадоў таму, але, верагодна, існуе значна даўжэй. Неўзабаве ўрачы і даследчыкі выявілі, што гэты мікроб жыве ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных па ўсім свеце. Бактэрыя ўстойлівая да цэлага шэрагу антыбіётыкаў і, хутчэй за ўсё, становіцца прычынай развіцця сепсісу ў нованароджаных у першыя 72 гадзіны іх жыцця. Навуковец заявіў, што бактэрыя NRCS-A рэдка выклікае інфекцыі ў дарослых людзей, аднак вельмі заразная для «неданошаных дзяцей».

# ПЕРАДАЦЬ ЭСТАФЕТУ ПАМЯЦІ

**Форум маладых гісторыкаў Саюзнай дзяржавы прайшоў у Смаленску ў рамках XVII фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».**




Культурна-выставачны цэнтр імя Ценішавых гасцінна расчыніў свае дзверы перад удзельнікамі мерапрыемства, сярод якіх студэнты і аспіранты ВНУ, маладыя вучоныя, выкладчыкі школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.

Падчас адкрыцця форуму Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што вельмі важна перадаць эстафету памяці моладзі і зразумець, ці падтрымліваюць яны каштоўнасці цяперашняга пакалення, ці бяруць на сябе адказнасць за будучыню Саюзнай дзяржавы.

— Форум маладых гісторыкаў Саюзнай дзяржавы — гэта выдатная магчымасць для зверкі нашых пазіцый адносна будучыні. У нас ёсць асаблівы абавязак памяці перад пакаленнем пераможцаў. Для гэтага ў Саюзнай дзяржаве павялічана колькасць мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнай накіраванасці. За апошнія тры гады іх колькасць вырасла ў тры разы, а з саюзнага бюджэту накіравана на такія мерапрыемствы ўдвая больш сродкаў. Але не гэтым ацэньваецца тое, што нам удаецца дастукацца да маладых сэрцаў, якія праз 15—20 гадоў возьмуць на сябе адказнасць за будучыню Беларусі і Расіі, — заявіў ён.

Форум праходзіў на працягу ўсяго дня і быў разбіты на некалькі секцый. Так, маладыя гісторыкі Саюзнай дзяржавы абмяркоўвалі самыя надзённыя тэмы ад выкрыцця падвойных стандартаў Захаду ў сучаснай сусветнай палітыцы да стварэння адзінага падручніка па гісторыі.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

# РАМОНТ КАТЛОЎ, ЗАМЕНА СЕТАК І ЗАПАС ПАЛІВА

## Сфарміравана 700 аварыйных брыгад

Усе мерапрыемствы, у асноўным падрыхтоўчыя, даручана завяршыць да 20 верасня. А да 30 верасня неабходна аформіць і зарэгістраваць пашпарты гатоўнасці як цеплавых крыніц, так і спажыўцоў цеплавой энергіі.

«На 100 % ужо выкананы прафілактычныя агляды сістэм ацяплення жылых дамоў — гэта 38 тысяч індывідуальных цеплавых пунктаў, апрасавана 42 тысячы сістэм ацяплення жылых дамоў і 100 % цеплавых пунктаў. Адрамантавана каля 410 тысяч пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў (плюс 4 % да плана). У цэлым план выкананы прыкладна на 90 %. Па стане на пачатак гэтага тыдня аформлена 98 % пашпартоў гатоўнасці на цеплавыя крыніцы аб'ектаў ЖКГ і 79 % пашпартоў гатоўнасці цеплавых крыніц іншых ведамстваў», — паведаміў Аляксей Філановіч.

Ужо цяпер падрыхтаваліся энергетыкі да магчымых складанасцяў гэтай зімой. Для ліквідацыі аварыйных сітуацый у асенне-зімовы ацяпляльны перыяд па краіне сфарміравана звыш 700 аварыйна-аднаўленчых брыгад з колькасцю работнікаў парадку 3,5 тысячы чалавек. У гатоўнасці знаходзіцца 15 перасоўных модульных кацельняў. Маецца дастатковая колькасць крыніц электразабеспячэння для падтрымання працаздольнасці аб'ектаў ЖКГ у выпадку кароткачасовага спынення электразабеспячэння.

«Падрыхтоўка аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі да работы ў асенне-зімовы перыяд знаходзіцца на высокім узроўні, як і ў папярэднія гады. Поўная гатоўнасць аб'ектаў будзе забяспечана ў тэрміны», — падкрэсліў спецыяліст.

## Сталіца да запуску ацяплення гатова

Жыллёвы фонд Мінска, які знаходзіцца на абслугоўванні ЖКГ раёнаў, гатовы да запуску ацяплення. Як расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жылфонду і вытворчых пытаннях ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Рыгор КАЗУНКА,** у склад аб'яднання ўваходзіць 66 жыллёва-камунальных прадпрыемстваў.

У іх ліку: 9 ЖКГ, 8 ЖРЭА і 38 ЖЭУ раёнаў горада, а таксама 9 камунальных прадпрыемстваў. На тэхнічным абслугоўванні знаходзіцца 6438 дамоў агульнай плошчай 34,7 мільёна квадратных метраў, — удакладніў Георгій Казунка. — А рашэннем Мінгарвыканкама ад 18 мая 2024 года зацверджаны аб'ёмы работ па падрыхтоўцы жыллёвага фонду да асенне-зімовага перыяду. Усе прадпрыемствы, якія ўваходзяць у склад аб'яднання, атрымалі 100 % пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і цеплавых крыніц.

За час падрыхтоўкі ўдалося выканаць прафрамонт і апрасоўку 6324 дамоў, гідрапнеўмапрамыўку 1723 будынкаў і рамонт 234 вадзяных падагравальнікаў. Сюды ўваходзіць і папраўка электраабсталявання ў 6438 дамах, шкленне месцаў агульнага карыстання (больш за 10 тысяч квадратных метраў), рамонт цеплаізаляцыі (600 кубічных метраў) і 285 цыркуляцыйных і іншых помпаў, замена 146 сістэм аўтаматычнага рэгулявання і 120 прыбораў уліку цяпла.

Намеснік генеральнага дырэктара адзначыў, што ў стадыі завяршэння знаходзяцца работы па рамонце канструктыўных элементаў будынкаў — дахаў, стыкаў, водаадводных сістэм, а таксама ўцяпленне загараджальных канструкцый. Ён растлумачыў, што сёння адрамантаваны 385 тысяч квадратных метраў дахаў і 231 тысяча пагонных метраў стыкаў, уцяплілі 32 тысячы квадратных метраў загараджальных канструкцый (99 % ад запланаванага), абнавілі 4,5 тысячы балконаў (94 % ад неабходнай колькасці). У цяперашні час эксплуатацыйныя арганізацыі, згодна з зацверджаным графікам, запаўняюць хімічна вычышчанай вадой унутрыдамавыя сістэмы цеплазабеспячэння. Гэтыя работы будуць выкананы да 15 верасня.

Падчас падрыхтоўкі да халадоў асаблівая ўвага — жылым будынкам з газавым абсталяваннем. Усяго на тэхнічным абслугоўванні ЖКГ раёнаў Мінска знаходзіцца 527 такіх аб'ектаў на 9520 кватэр. З пачатку года адрамантаваны 43 дымавыя і 92 вентыляцыйныя каналы. Яны знаходзяцца ў тэхнічна спраўным стане.

Таксама да зімы ў Мінску плануюць нарыхтаваць 5880 тон процігалалёдных рэагентаў. Ужо цяпер маецца запас скрабкоў і снегавых рыдлёвак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З нагоды

# ВЕСЕЛА І БЯСПЕЧНА

## Як будзем адзначаць Дзень нараджэння сталіцы


Фота БелТА.

**Ужо на гэтых выхадных жыхары Мінска адсвяткуюць Дзень горада. Сёлета беларускай сталіцы спаўняецца 957 гадоў. Праграма абяцае быць даволі насычанай, аднак не варта забываць аб правілах бяспекі. Падчас святочных мерапрыемстваў сталічная міліцыя пяройдзе на нясенне службы ва ўзмоцненым рэжыме, а колькасць нарадаў у месцах адпачынку грамадзян павялічыцца.**

«У Дзень горада, 14 верасня, праграму мерапрыемстваў у 10.00 адкрые ўрачыстае ўскладанне кветак да абеліска «Мінск — горад-герой», у якім возьмуць удзел структурныя падраздзяленні Мінгарвыканкама, міжнародныя дэлегацыі, грамадскія аб'яднанні. Праграму працягне фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны» — відовішчнае тэатралізаванае мерапрыемства, у якім возьмуць удзел клубы гістарычнай рэканструкцыі, аднаўляючы падзеі з XIII стагоддзя да перыяду Вялікай Айчыннай вайны», — распавяла **начальнік аддзела ўстаноў культуры ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Святлана СІЛІЧ.**

Яшчэ адна важная лакацыя — пляцоўка каля Палаца спорту, дзе будуць спаборнічаць за права звацца наймацнейшым найлепшыя пажарныя-ратавальнікі. Тут жа стартуе Алімпійскі дзень, які адкрыецца ў 12.00. «Спаборніцтвы завершацца канцэртнай праграмай з удзелам маладых талентаў горада. А ў 23.00 неба над Мінскам упрыгожыць святочны салют», — адзначыла Святлана Сіліч.

У Верхнім горадзе ў 12.00 пачнецца праграма «Залатыя хіты» Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. «На гэтай жа пляцоўцы ўвечары будуць падведзены вынікі конкурсу «Мінчанін года». Характэрна, што сёлета на адной сцэне з артыстамі эстрады выступяць і непрафесійныя артысты», — распавяла спецыяліст.

### ПАД АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛЕМ

У Дзень горада Мінска каля месцаў масавых гулянняў адкрыюцца КПП, частка з іх — з аранжавымі дахамі, а таксама камеры захоўвання для рэчаў. Як будуць ахоўваць правапарадак у горадзе 14 верасня, распавёў журналістам **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама Сяргей ГАРОХАЎ.** «У горадзе Мінску да 14 верасня вызначаны асноўныя святочныя лакацыі, якія ў гэты ж дзень будуць абследаваны і ўзяты пад кантроль пешымі нарадамі міліцыі. У месцах, дзе запланавана прысутнасць больш за 500 грамадзян, будзе арганізавана работа кантрольна-прапускных пунктаў з мэтай выключэння свабоднага праходу грамадзян з забароненымі да праносу прадметамі», — адзначыў Сяргей Гарохаў.

На зялёнай зоне скрыжавання праспектаў Машэрава і Пераможцаў пройдзе фестываль гістарычнай рэканструкцыі, у раёне Палаца спорту разгорнуцца спартыўныя спаборніцтвы, якія таксама будуць пад асаблівым кантролем праваахоўнікаў. Тут задзейнічаюць не толькі службы і падраздзяленні ГУУС Мінгарвыканкама, але і конны патруль міліцыі.

«Пропуск на лакацыю каля Палаца спорту будзе ажыццяўляцца праз 8 КПП і 42 пункты пропуску, да Верхняга горада — праз 6 і 15 адпаведна. Ужо з 07.00 14 верасня КПП будуць гатовыя да работы», — адзначыў Сяргей Гарохаў.

Ён дадаў, што для грамадзян асаблівых катэгорый, такіх як ветэраны, бацькі з маларэтнімі дзецьмі, інваліды, пункты пропуску пазначаць аранжавым колерам. «Праход да месца правядзення мерапрыемстваў з веласіпедамі, самакатамі і скутарамі будзе забаронены. Акрамя гэтага, каля Палаца спорту адкрыюцца тры камеры захоўвання, якія таксама будуць пазначаны», — адзначыў Сяргей Гарохаў.

Дарожны рух побач са святочнымі лакацыямі абмяжуюць. У 23.00 на час запуску феерверка ўваход у сквер Старасцінская Слабада будзе перакрыты, абмежавана па перыметры паркоўка транспарту.

Вартавыя парадку нагадваюць, што ў месцы правядзення масавых мерапрыемстваў не дапусцяць асоб у стане алкагольнага ап'янення, а таксама тых, хто мае пры сабе забароненыя прадметы. Для рэагавання на аператыўную абстаноўку ў ГУУС будзе сфарміраваны міжведамасны гарадскі аператыўна-сітуацыйны штаб. Дарэчы, чатырохногіх гадаванцаў гараджанам і гасцям сталіцы праваахоўнікі таксама рэкамендуюць пакінуць дома.

### ПРА РУХ МЕТРО І КІРМАШЫ

Мінскае метро зменіць графік работы 14 верасня. З 07.00 да 24.00 на Маскоўскай і Аўтазаводскай лініях інтэрвал руху цягнікоў складзе пяць хвілін, а на Зеленалужскай лініі ў гэты ж перыяд — восем. У Мінскім метрапалітэне рэкамендуюць пасажырам загадзя набываць жэтоны і праязныя білеты або аплачваць праезд бескантактным спосабам.

Традыцыйна будуць працаваць кірмашы на пляцоўцы каля Палаца спорту. 14 верасня — з 11.00 да 23.00 і 15 верасня — з 13.00 да 22.00.

У дзень асноўных мерапрыемстваў (14 верасня), якія ўключаюць правядзенне на названай пляцоўцы спартыўнага свята «Алімпійскі дзень», арганізатарам якога выступае Нацыянальны алімпійскі камітэт, да 17.00 у аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання будзе спынена рэалізацыя алкагольных напояў (за выключэннем слабаалкагольных напояў на разліў).

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# БРІКС з плюсам

## Чым прываблівае міжнароднае аб'яднанне?

**Аб жаданні далучыцца да БРІКС заявілі 34 краіны. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на сустрэчы высокіх прадстаўнікоў дзяржаў аб'яднання, якія курыруюць пытанні бяспекі (удзел у ёй узяў Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч), што прайшла ў Канстанцінаўскім палацы ў Санкт-Пецярбургу, паведаміла ТАСС. «Менавіта вось у гэтых залах і быў пакладзены пачатак стварэння БРІКС», — нагадаў расійскі лідар. Ён расказаў, што тады сустрэліся кіраўнікі Расіі, Індыі і Кітая, якія дамовіліся арганізоўваць рэгулярныя сустрэчы на вышэйшым узроўні, а таксама па некаторых іншых кірунках. Такім чынам быў створаны РІК, куды ўваходзілі Расія, Індыя і Кітай. «А потым усё гэта атрымала адпаведнае развіццё, — дадаў Уладзімір Пуцін. — Карыстаючыся выпадкам, прасіў бы перадаць кіраўнікам вашых краін, што мы чакаем іх на саміце (форум пройдзе 22—24 кастрычніка ў Казані. — Рэд.), дзе плануецца прадметна абмеркаваць перспектывы далейшага нарошчвання ўсебаковага партнёрства краін — удзельніц БРІКС, а таксама зацвердзіць пакет дамоўленасцяў па розных галінах і напрамках супрацоўніцтва». Чым жа прываблівае міжнароднае аб'яднанне, якое з цягам часу пераўтварылася ва ўплывовую глабальную пляцоўку?**




### ДЫЯЛОГ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

Арганізацыя была створана ў 2006 годзе па ініцыятыве Расіі. Яе сузаснавальнікамі выступілі Бразілія, Расія, Індыя і Кітай. З назвы гэтых краін на англійскай мове быў утвораны акронім BRIC. Пасля далучэння да іх у 2011 годзе Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі аб'яднанне атрымала назву BRICS. Яго мэтай яшчэ на першым саміце ў Екацярынбургу ў чэрвені 2009 года было вызначана «развіццё паслядоўнага, актыўнага, прагматычнага і адкрытага дыялогу і супрацоўніцтва паміж краінамі». Пазней былі ўзгоднены такія прынцыпы дзейнасці, як неблокавы характар і ненакіраванасць супраць трэціх бакоў.

У маі 2022-га на сустрэчы міністраў замежных спраў краін аб'яднання, якая праходзіла ў рэжыме відэаканферэнцыі, Кітай прапанаваў запусціць працэс пашырэння БРІКС, каб «павысіць прадстаўленасць аб'яднання і яго ўплывовасць у свеце». На працягу года заяўкі на ўступленне ў арганізацыю падалі каля 20 краін. На 15-м саміце, які прайшоў у Ёханесбургу летась 22—24 жніўня, было абвешчана аб далучэнні да арганізацыі шасці краін — Аргенціны, Егіпта, Ірана, ААЭ, Саудаўскай Аравіі і Эфіопіі. Аднак у снежні 2023 года Аргенціна адмовілася ад уступлення (пасля прыходу да ўлады прэзідэнта Хаўера Мілея), астатнія краіны сталі паўнапраўнымі членамі БРІКС з 1 студзеня 2024 года. Такім чынам, іх агульная колькасць узрасла да дзесяці. Аб'яднанне атрымала неафіцыйную назву БРІКС+.

На платформе аб'яднання рэгулярна праходзяць перагаворы на ўзроўні кіраўнікоў МЗС, міністраў фінансаў, аховы здароўя, адукацыі, навукі і сельскай гаспадаркі, сакратароў саветаў бяспекі. З 2015 года праводзяцца Грамадзянскі, Парламенцкі і Маладзёжны форумы БРІКС, а таксама медыясаміты. Цяпер у рамках БРІКС дзейнічае больш за 20 фарматаў. Іх тэматыка ахоплівае такія кірункі, як энергаэфектыўнасць, змяненне клімату, харчовая бяспека, барацьба з беднасцю, устойлівае развіццё, дзейнасць міжнародных фінансавых інстытутаў.

У 2023 годзе доля ВУП па парытэце пакупніцкай здольнасці краін БРІКС, паводле звестак Сусветнага банка, складала 31,5 працэнта (у G7 — 30 %). Пасля пашырэння аб'яднання яго доля ўзрасла да 35 працэнтаў сусветнага ВУП — такія даныя (на аснове падлікаў па выніках мінулага года) прывяла сёлета ў студзені кіраўнік Банка Расіі Эльвіра Набіуліна, паведаміла ТАСС. Акрамя таго, далучэнне да БРІКС новых дзяржаў прывяло да павелічэння долі гэтай арганізацыі ў сусветнай вытворчасці нафты (па разліках Дзяржаўнага банка Індыі, з 18 да 40 працэнтаў), што ўносіць значныя змены ў сусветную плацежную сістэму і ў фарміраванне сусветных цэн на нафту. На дзяржавы БРІКС+ прыпадае 46 працэнтаў насельніцтва планеты.

### АСАБЛІВАЯ РОЛЯ

Першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей Лукашэвіч падрабязна расказаў, навошта Беларусі БРІКС і чым наша краіна можа быць карысная гэтаму аб'яднанню. «Цяпер ёсць надзённае запатрабаванне ў новай архітэктуры бяспекі на рэгіянальным і глабальным узроўнях. Сістэме, што будзе адкрыта для ўсіх дзяржаў, якія імкнуцца да бяспечнай і квітнеючай будучыні. Якая ў перспектыве можа стаць мадэллю пабудовы глабальнай бяспекі на прынцыпах яе непадзельнасці, шматпалярнасці, узаемнай




павагі, раўнапраўя суверэнных дзяржаў, вяршэнства міжнароднага права, — падкрэсліў Сяргей Лукашэвіч. — Краіны БРІКС, якія валодаюць вялізнымі тэхналагічнымі, фінансавымі, чалавечымі і прыроднымі рэсурсамі, могуць адыграць асаблівую ролю ў пабудове больш бяспечнага і квітнеючага свету».

Дыялогавая пляцоўка БРІКС прыцягвае ўсё большую ўвагу сусветнай супольнасці, якая імкнецца да больш справядлівага балансу палітычных і эканамічных адносін. «Беларусь у гэтым пытанні займае актыўную і дакладна выяўленую пазіцыю, — адзначыў Сяргей Лукашэвіч. — Адпраўным пунктам руху нашай краіны ў бок БРІКС стала пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі 16 мая 2023 года на адрас кіраўнікоў краін — удзельніц аб'яднання з заяўкай на далучэнне. Гэты крок дазволіў Беларусі ўвайсці ў першы «пул» дзяржаў-кандыдатаў (разам з такімі краінамі, як Алжыр, Бангладэш, Бахрэйн, Балівія, Венесуэла, В'етнам, Куба, Гандурас, Інданезія, Казахстан, Кувейт, Марока, Нігерыя, Палесціна, Сенегал і Тайланд). Сур'ёзнасць намераў нашай краіны адносна БРІКС неадназначна дэманстравалася актыўным і зацікаўленым удзелам Беларусі на розных узроўнях у тэматычных мерапрыемствах аб'яднання».

Беларусь палічвае ў першай дзясятцы атрымаць статус партнёра па супрацоўніцтве ў БРІКС. Аб гэтым раней заявіў міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў. Паводле яго меркавання, для нас БРІКС — гэта перш за ўсё вельмі добрая пляцоўка з вялікай колькасцю магутных дзяржаў свету, на якой можна прасоўваць свае знешнепалітычныя, знешнеэканамічныя і знешнегандлёвыя інтарэсы. Цяпер наша краіна ўдзельнічае абсалютна ва ўсіх мерапрыемствах пад парасонам БРІКС, што дало сур'ёзны імпульс да дадатковага развіцця адносін з дзяржавамі гэтага аб'яднання.

«Мы імкнёмся не проста да такога спарадычнага ўдзелу, а да атрымання нейкага статусу ў гэтай арганізацыі. Статусу партнёра па супрацоўніцтве. Пакуль так дамовіліся, што ён будзе. З прычыны таго, што на сённяшні момант не сфармулявалі гэты канкрэтны юрыдычны тэрмін і як яго атрымаць», — распавёў кіраўнік МЗС.

Тым не менш Беларусь падала заяўку ў ліку першых. «І мы ад усіх партнёраў — краін-членаў гэтай арганізацыі — ужо атрымалі пацвярджэнне, што калі будзе першае надзяленне 10 заявак на статус партнёра, то мы будзем сярод гэтых дзесяці. Пакуль нас стрымлівае толькі афармленне гэтага статусу. Не ў адносінах да Беларусі, а ў прынцыпе юрыдычнага гэтага тэрміна. Будзем спадзявацца, што да саміту ў Кастрычніку ён будзе выпрацаваны», — заявіў Максім Рыжанкоў.

### СТАБІЛЬНАСЦЬ І ДАБРАБЫТ

Беларусь гатова зрабіць свой унёсак у агульныя намаганні. «Слова «Мінск» з 2014 года стала сімвалам упартых спроб знайсці мірнае вырашэнне ўкраінскага канфлікту і абнавіць сістэму еўрапейскай бяспекі. Мы верым у шматмерны падыход да бяспекі, які ўключае эканамічную стабільнасць і сацыяльны дабрабыт народаў, — адзначыў першы намеснік міністра замежных спраў. — Краіны БРІКС, іх сябры і партнёры складаюць вялікую большасць у свеце і маюць усе перспектывы стаць новай эканамічнай сілай. Патэнцыял БРІКС велізарны. Нам неабходна аб'яднаць нашы намаганні супраць фрагментацыі шматбаковай гандлёвай сістэмы, узмацнення пратэкцыянізму і ўвядзення незаконных санкцый», — перакананы першы намеснік міністра замежных спраў.

Паводле яго слоў, наша краіна можа садзейнічаць рэалізацыі такіх маштабных міжнародных праектаў, як транспартны калідор Поўнач—Поўдзень і ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях». «Мы падтрымліваем намеры БРІКС весці шырокі дыялог з зацікаўленымі краінамі з мэтай стварэння поля для актывізацыі супрацоўніцтва ў многіх сферах, пачынаючы ад сельскай гаспадаркі для забеспячэння глабальнай харчовай бяспекі і заканчваючы высокатэхналагічнымі распрацоўкамі, — заявіў Сяргей Лукашэвіч. — Беларусі ёсць што прапанаваць БРІКС. Мы гатовы зрабіць унёсак у агульную справу па забеспячэнні ўстойлівага развіцця. Рады падзяліцца вопытам рэалізацыі міжнародных праектаў, звязаных з маладзёжнай палітыкай, аховай здароўя, аховай навакольнага асяроддзя і ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў, прытрымліваючыся Стратэгіі эканамічнага партнёрства БРІКС-2025. З'яўляючыся адным з вядучых сусветных экспарцёраў калійных угнаенняў і шырагу катэгорый харчовых тавараў, а таксама машын і тэхналогій у галіне сельскай гаспадаркі, Беларусь гатова рабіць свой унёсак у падтрыманне міжнароднай харчовай бяспекі», — адзначыў першы намеснік міністра замежных спраў. Ён таксама звярнуў увагу, што Беларусь поўнасцю падзяляе мэты і падыходы БРІКС адносна фарміравання новага справядлівага, сапраўды шматпалярнага сусветнага парадку.

### КЛЮЧАВЫ ЭЛЕМЕНТ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, выступаючы ў ліпені ў Санкт-Пецярбургу на парламенцкім форуме БРІКС, прапанавала правесці саміт «БРІКС плюс» па пытаннях міжнароднага міру, бяспекі і ўстойлівага развіцця. Як справядліва лічыць спікер Савета Рэспублікі, гэта дасць магчымасць больш эфектыўна ўрэгуляваць ужо існуючыя канфлікты.

У сваю чаргу Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка падкрэсліў, што Беларусь гатова падзяліцца ўласным заканадаўчым вопытам у цэлым шэрагу кірункаў, у тым ліку па барацьбе з незаконнымі санкцыямі і забеспячэнні бяспекі. Спікер заклікаў парламентарыяў краін БРІКС выкарыстоўваць свой патэнцыял для ўплыву на ААН і іншыя міжнародныя структуры для зняцця аднабаковых санкцый з боку ЗША і іх сатэлітаў. Ён выступіў з ініцыятывай аб удасканаленні разліковых плацежных сістэм і фарміраванні рэзервовых валют.

Усе гэтыя ідэі выклікалі жывую цікавасць у калег парламентарыяў з іншых краін. І гэта надзвычай важна, паколькі беларуская парламенцкая дэлегацыя ўпершыню ўдзельнічала ў такім фармаце. Старт аказаўся вельмі ўдалы. Дарэчы, Прэзідэнт Расіі, звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, выказаўся за стварэнне агульнай парламенцкай структуры глабальнага аб'яднання. «БРІКС — адзін з ключавых элементаў шматпалярнага светапарадку, які фарміруецца і ва ўсё большай ступені адлюстроўвае інтарэсы і спадзяванні дзяржаў і Глабальнага Поўдня, і Усходу, і нашых прыхільнікаў ва ўсім свеце. А колькасць іх вельмі вялікая і пастаянна ўзрастае, — сказаў Уладзімір Пуцін. — Мы адкрыты да ўмацавання ўзаемадзеяння з усімі краінамі, якія выказваюць цікавасць да дзейнасці БРІКС».

**Захар БУРАК.**

**Даслоўна**

### «Беларусь мэтанакіравана ўносіць уклад ва ўмацаванне Глабальнай Большасці»

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у сваім выступленні на трэцім саміце «Голас Глабальнага Поўдня».

«Беларусь мэтанакіравана ўносіць уклад ва ўмацаванне Глабальнай Большасці, актыўна ўдзельнічаючы ў міжнародных структурах, якія нас аб'ядноўваюць: у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Руху недалучэння, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а таксама БРІКС, партнёрамі якой мы разлічваем стаць у найбліжэйшай перспектыве», — адзначыў Прэзідэнт.

Беларускі лідар заўважыў, што эпоха заходняга панавання адыходзіць у мінулае. «Цэнтр глабальнага прагрэсу, эканамічнай гравітацыі, ды і прыняцця палітычных рашэнняў ссоўваецца на Поўдзень і Усход, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Гэта патрабуе ад нас больш актыўна праяўляць лідарства ў міжнародных справах».

# «НЕ ЗВЫЧАЙНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА, А САПРАЎДНАЕ СВЯТА»

## Даведаліся, чым сёння жыве наша пошта

**Днямі прадпрыемства «Белпошта» правяло ўжо XXVII Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі сярод спецыялістаў па паштовай дзейнасці і паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Конкурс — гэта даўняя традыцыя Белпошты, якая спрыяе ўмацаванню карпаратыўнага духу работнікаў прадпрыемства, дазваляе выяўляць і ўдасканальваць прафесійнае майстэрства, творчыя і дзелавыя якасці работнікаў гэтага шматтысячнага калектыву. Карэспандэнт «Звязды» далучыўся да слаўнай традыцыі і высветліў, чым сёння жывуць работнікі паштовай галіны.**

«Белпошта» захоўвае традыцыі, выкарыстоўвае ў рабоце перадавыя інфармацыйныя тэхналогіі, удасканальвае падыходы ў працы, умела рэагуючы на запыты сучаснага спажыўца. Конкурс прафесійнага майстэрства — гэта ўнікальная магчымасць убачыць прафесіяналаў высокага ўзроўню ў сваёй прафесіі. На базе адпачынку «Дружба», што пад Астрашыцкім гарадком, гэтым разам за званне найлепшых пазмагаліся сем каманд па шэсць чалавек.

### Пошта са знакам якасці

«Гэта не звычайнае мерапрыемства, а сапраўднае свята для нас, паштавікоў, — распавяла **генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Святлана ЮРКЕВІЧ.** — 27-ы год запар мы праводзім конкурс прафесійнага майстэрства нашых работнікаў. Сёлета ў ім удзельнічаюць тыя людзі, якія, як мурашкі, працуюць на палях на карысць нашага прадпрыемства і ўсёй дзяржавы ў цэлым. Я спадзяюся, што такія конкурсы паспрыяюць не толькі выяўленню найлепшых, але і абмену вопытам, згуртаванню і адзінству калектыву, бо гэта таксама вельмі важна».

На гэтым мерапрыемстве няма выпадковых людзей. Сюды трапілі пераможцы абласнога этапу конкурсу. Усе яны маюць прамое дачыненне да прафесійнага свята пошты. «Сусветны дзень пошты адзначаем не толькі мы. Гэта 182 краіны, якія працуюць і ўзаемадзейнічаюць адна з адной у рамках Сусветнага паштовага саюза. Наша краіна не адстае ад іншых і таксама бярэ ўдзел і адзначае гэтае цудоўнае свята паштароў усяго свету», — адзначыла Святлана Юркевіч.

Адной з прыярытэтных задач паспяховага развіцця і прыбытковай работы «Белпошты» з'яўляецца высокая якасць аказання паслуг і культуры абслугоўвання карыстальнікаў. З году ў год прадпрыемства «Белпошта» ўкараняе новыя тэхналогіі і паслугі. «Мы стараемся палепшыць атрыманне нашых паслуг кліентамі, каб гэта было проста, даступна і зручна. Таму ідзём у нагу з часам разам з трансфармацыяй нашых паслуг. Гэтым летам мы прэзентавалі новы праект «QR-бокс», які спросціць і зробіць нашы паслугі больш даступнымі. Ён дазваляе пры дапамозе мабільнага дадатку аформіць паштовыя адпраўленні анлайн і прыйсці ў аддзяленне, не чакаючы чаргі. Можна прыйсці, счытаць QR-код і пакласці пасылку ў акенца. Сёння такія QR-боксы ўстаноўлены ў Мінску, а таксама ў абласных цэнтрах. Да канца года плануем пашырыць гэтую лінейку ў буйных гарадах», — сказала Святлана Юркевіч.

### Жыццёва неабходная прафесія

Сістэмная работа над якасцю, пошук і рэалізацыя магчымасцяў для паляпшэння сваёй дзейнасці, працэсаў, паслуг, сэрвісаў, несумненна, прыносіць станоўчыя вынікі. Сярод запрошаных гасцей — Валянціна Пух. Яна аддала прадпрыемству многія гады жыцця. Высокакваліфікаваны спецыяліст і эфектыўны кіраўнік Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта», спагадлівы калега, а сёння — **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, Валянціна ПУХ** звярнулася да ўсіх удзельнікаў:





«Я называю вас калегамі, таму што паштавікі назаўжды застануцца ў маім сэрцы. У кожнай сям'і, на кожным прадпрыемстве і ў кожнай дзяржаве ёсць вельмі важныя дзве рэчы: традыцыі і людзі. Нашаму прадпрыемству і нам пашанцавала».

Паводле яе слоў, прафесія паштавікоў — гэта жыццёва неабходная прафесія не толькі ў нашай краіне, але і ў цэлым свеце: «Увявіце: калі б не было паштальёнаў, спецыялістаў паштовай дзейнасці, наколькі наш свет быў бы ўшчэмлены. А сёння нас тысячы. Тысячы людзей, якія дораць усмешкі, якія ўмеюць правільна падабраць патрэбныя словы ў складаныя хвіліны і якія прыносяць добрыя рэчы».

Валянціна Мікалаеўна пажадала ўсім прысутным у Год якасці выходзіць на самыя лепшыя вынікі. Указам Прэзідэнта Беларусі 2024 год аб'яўлены Годам якасці. Гэта сведчыць, што паняцце якасці ў нашай краіне мае вялікае значэнне ва ўсіх сферах жыцця. «Белпошта» пастаянна працуе над якасцю аказання паслуг, імкнецца дасягаць пастаўленых «мэт» у галіне якасці.

«Яшчэ непрацяглы перыяд я працую дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, але, тым не менш, праходзячы міма любога аддзялення паштовай сувязі, вядома, у мяне замірае сэрца. Для мяне пошта — гэта прадпрыемства, на якім я адпрацавала 33 гады, гэта адзінае прадпрыемства ў маёй працоўнай дзейнасці. Я прыйшла працаваць у аддзяленне паштовай сувязі горада Брэста паштальёнам, — распавяла Валянціна Пух. — У гэтай арганізацыі вырасла да дырэктара, 16 гадоў адпрацавала кіраўніком буйнога прадпрыемства абласнога ўзроўню, у падначаленні якога ў пэўныя перыяды было каля трох тысяч чалавек і больш за 600 аб'ектаў паштовай сувязі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Таму для мяне гэта роднае прадпрыемства. Запрашэнне на конкурс — вялікая радасць убачыць калег, акунуцца ў святочны настрой і гэтую традыцыю».

За гэты перыяд да Валянціны Мікалаеўны як да дэпутата ні разу не звярталіся супрацоўнікі пошты. «І мне вельмі прыемна тое, што і грамадзяне ніколі не звярталіся па пытаннях якасці аказання паслуг у галіне паштовай сувязі. Усе паштавікі мяне ведаюць, яшчэ памятаюць, і, напэўна, няма неабходнасці ісці на прыём да дэпутата. Сёння я даступная, ёсць магчымасць патэлефанаваць, проста пагаварыць, калі ёсць праблемы. Я з імі сустракаюся ў Брэсце, калі працую ў акрузе. Наведваю працоўныя калектывы, маю зносіны з імі, слухаю іх праблемы. Людзі задаюць пытанні, просяць парады ў тым ці іншым кірунку. Я заўсёды гатовая падзяліцца сваім вопытам: жыццёвым, працоўным, прафесійным».

Пошта ў насельніцтва асацыіруецца ў першую чаргу з паштальёнам. Гэта было спакон вякоў. «Менавіта прадстаўнікі гэтай прафесіі бяруць удзел у конкурсе. Гэта конкурс і свята не толькі для іх, але і для ўсёй краіны, асабліва для таго насельніцтва, у рабоце з якім паштальён актыўна ўдзельнічае. Калі прадстаўнік з сельскага аддзялення паштовай сувязі сёння прыехаў на конкурс, паверце, да яго рыхтаваліся не толькі ўсім калектывам, але і ўсёй вёскай, якую паштальён абслугоўвае. Гэта вялікі гонар, такая падзея, якая дае магчымасць нашым паштальёнам яшчэ раз пацвердзіць, што мы патрэбныя і важныя людзям, што нас любяць і чакаюць, а пры дапамозе такіх мерапрыемстваў мы павышаем свой прафесіяналізм, яшчэ лепш і з вялікім задавальненнем будзем абслугоўваць людзей», — падсумавала Валянціна Пух.

### «Працаваць, каб радаваць усмешкай усіх кліентаў»

Пасля конкурсу знаёмства «Пад дэвізам — ЯКАСЦЬ!» каманды-ўдзельніцы адправіліся дэманстраваць хатнія заданні. Спачатку прадстаўнікі паштовай сферы выступілі з прэзентацыяй сумеснай кампазіцыі «Дрэва памяці», прысвечанай 80-й гадавіне вызвалення Беларусі. Затым адбылася прэзентацыя камандамі хатняга задання на тэму «Пад знакам якасці». Гэта свайго роду творчы нумар, у якім супрацоўнікі пошты прадэманстравалі сваю якасную паўсядзённую дзейнасць, а таксама распавялі пра новыя праекты і паслугі. Пасля гэтага ўдалося пазнаёміцца з удзельнікамі бліжэй.



«Падрыхтоўка да конкурсу была бурная і актыўная, — распавяла **спецыяліст па паштовай дзейнасці Вольга ШАЎКАЛА з Брэсцкага філіяла «Белпошты».** — Мы вельмі стараліся, сабралі ў кулак усе свае магчымасці і таленты, каб праявіць сябе на найвышэйшым узроўні. Рыхтаваліся два месяцы. Сёння са мной мае калегі — пераможцы абласнога этапу конкурсу прафесійнага майстэрства — найлепшыя ў сваёй справе. Радуе, што сёння разам з намі нашы кіраўнікі, падтрымка і клопат якіх для нас вельмі важныя».

Вось ужо тры гады **спецыяліст па паштовай дзейнасці аддзялення горада Мінска Ангеліна КУПРЫЯН** працуе ў гэтай сферы. Дзяўчына скончыла Мінскі дзяржаўны каледж сферы абслугоўвання. «У мяне былі выдатныя выкладчыкі. У новай паштовай сям'і мяне цёпла прынялі. Рада, што ўдалося ўстанавіць такі цесны кантакт з калегамі. Наша праца дынамічная і складаная як эмацыянальна, так і фізічна. Але самае галоўнае — гэта людзі, якія дораць пазітыў і матывацыю працаваць тут, каб радаваць сваёй усмешкай усіх кліентаў».

Як адзначыла Ангеліна, рыхтавацца было сапраўды цяжка. «Той аб'ём інфармацыі, які мы павінны былі паўтарыць, сапраўды велізарны. Я спадзяюся, што мы ўсе праявім сябе на 100 працэнтаў! Гэта вельмі важная падзея ў жыцці кожнага спецыяліста, і я б хацела, каб у гэтым мерапрыемстве з кожным годам удзельнічала ўсё больш і больш чалавек. Гэта ўнікальная магчымасць праявіць сябе, даказаць сабе тое, чаго ты варты».

У конкурсе прафесійнага майстэрства Ангеліна ўдзельнічае ўпершыню. Аднак з ёй сёння больш вопытныя калегі, якія абавязкова дапамогуць пры неабходнасці. «Тым не менш абсалютна ўсе ўдзельнікі хвалююцца, як у першы раз. Такая рэзкая змена абстаноўкі прымушае сабрацца і адаптавацца да новых умоў. Дзякуючы таму, што ў нас ёсць вопытныя і чулыя кіраўнікі, якія ўвесь час дапамагаюць нам з падрыхтоўкай, упэўнена, усё будзе добра», — падкрэсліла яна.

**Спецыяліст па паштовай дзейнасці Вольга КАЗЛОВА з вытворчасці «Мінская пошта»** працуе на прадпрыемстве ўжо 15 гадоў. «Гэта мой першы вопыт удзелу ў конкурсе прафесійнага майстэрства. Аднак сёлета я заняла першае месца на конкурсе «Мінскі майстар». Гэта вельмі цікавае мерапрыемства, на якім мы прэзентавалі паслугі продажаў, тое, што мы можам прапанаваць насельніцтву. У мяне была прэзентацыя заказнога пісьма — вельмі цікавая тэма, якую я добра прадставіла. Потым выконвалі практычныя заданні, на якіх мы прадэманстравалі прафесійныя веды. Затым была тэарэтычная частка — 50 пытанняў, на якія неабходна было адказаць за кароткі прамежак часу. З чатырох намінацый я аказалася найлепшай у трох. Часам працую ў сельскай мясцовасці і прапаноўваю паслугі, якія цікавяць пенсіянераў. Дарэчы, гарадскі і сельскі кантынгенты абсалютна розныя. На вёсцы людзі дабрэйшыя. Калі ідзеш па вёсцы і не ведаеш мінака, ён заўсёды з табой павітаецца. У былыя часы самымі першымі людзьмі лічыліся старшыня, настаўнік і паштальён. Апошні прыносіў весткі, як добрыя, так і дрэнныя. Таму паштальёна заўжды вельмі чакалі».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «БЕРЁЗАСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 15.10.2024.**

**Лот № 1: Термотоннель А 450КМ с инв. № 38534.**
Начальная цена с НДС 20 % – 1 560,00 руб.
Задаток – 156,00 руб.
**Лот № 2: Пресс БАЗ-3121 гидравлический пакетированный с инв. № 38394.**
Начальная цена с НДС 20 % – 10 920,00 руб.
Задаток – 1 092,00 руб.
**Лот № 3, в составе:**
**1. Линия крышки СКО 1-82 с инв. № 38334, 2. Ножницы по резке металла многодисковые Б4-СНОМ с инв. № 38514.**
Начальная цена с НДС 20 % – 52 920,00 руб.
Задаток – 5 292,00 руб.
**Лот № 4, в составе:**
**1. Линия крышки СКО 1-82 с инв. № 38515, 2. Ножницы по резке металла многодисковые Б4-СНОМ с инв. № 38532.**
Начальная цена с НДС 20 % – 52 920,00 руб.
Задаток – 5 292,00 руб.
**Лот № 5: Линия крышки ПТ-51 для изготовления крышек Twist Off для укупорки детского питания.**
Начальная цена с НДС 20 % – 956 400,00 руб.
Задаток – 95 640,00 руб.
**Лот № 6: Линия крышки СКО1-58 для изготовления крышек типа 1 (СКО) к стеклянным и крышек к жестяным банкам.**
Начальная цена с НДС 20 % – 36 840,00 руб.
Задаток – 3 684,00 руб.
**Лот № 7: Безмасляный винтовой компрессор низкого давления Atlas Copco ZE 3.**
Начальная цена с НД 20 % – 192 000,00 руб.
Задаток – 19 200,00 руб.
**Лот № 8: Компрессор низкого давления Atlas Copco ZE 3.**
Начальная цена с НДС 20 % – 192 000,00 руб.
Задаток – 19 200,00 руб.
**Лот № 9: Растариватель биг-бэгов.**
Начальная цена с НДС 20 % – 24 840,00 руб.
Задаток – 2 484,00 руб.
**Лот № 10: Ручной растариватель мешков.**
Начальная цена с НДС 20 % – 13 800,00 руб.
Задаток – 1 380,00 руб.
**Лот № 11, в составе:**
**1. Система внутризаводского оборудования пневмотранспорта. 2. Бункер 10 м³ – 4 шт.**
Начальная цена с НДС 20 % – 198 240,00 руб.
Задаток – 19 824,00 руб.
**Лот № 12: Емкость 100 м³ – 12 шт.**
Начальная цена с НДС 20 % – 1 598 400,00 руб.
Задаток – 100 000,00 руб.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

**Местонахождение Лотов №№ 1–12:**
Территория ОАО «Березастройматериалы»
по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Береза,
ул. Свердлова, д. 161.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **10.10.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ:

**1) Объекты бывшего в/г, комплекс № 4: бытовой домик АЭР, склад НЗ с подвалом и боксом на 10 м/м, мощение, гараж техники с котельной, площадкой; контрольно-технический пункт парка АЭР, водопроводная сеть, около г.п. Россь, Росского с/с, 39, 39/1-39/3, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 11: медпункт, два здания штаба с пристройкой, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 51, 51/1, 51/2, в г. п. Россь, Росского с/с, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 7 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится **10.10.2024 в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **04.10.2024 до 16.00**.

**3) Здание учебного центра с составными частями и принадлежностями, гараж по ул. Красноармейская, 39, 39/1, г. п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**4) Здание кухни-столовой с подвалом и террасой, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 48, г.п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**Аукцион состоится 15.10.2024 в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу:
**г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.**

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **09.10.2024 до 16.00**.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.**
в городе Гродно **8 (0152) 62 39 24, 62 39 31, 62 39 23.**
Дополнительная информация размещена на сайте:
**https://au.nca.by**

УНП 500042135

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по
продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 24.10.2024.**

**Лот № 1:**
Сооружение (инв. №: 500/С-1005851),
площадь – 1718 кв. м.

Адрес: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49.
Земельный участок № 500000000007009184, 0,1718 га.
Право временного пользования земельным участком с 23.03.2021 по 31.01.2031.

Начальная цена с НДС 20 % – 64 200,00 долларов США.
Задаток – 20 578,00 руб.

**Шаг электронных торгов** – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **21.10.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

## В ДОПОЛНЕНИЕ К ИЗВЕЩЕНИЮ, *опубликованному в газете «Звязда» 24.08.2024 № 165 (30299),* сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие

## «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 24.09.2024 открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды

**Лот № 1.** Часть изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-708179937, расположенного на первом этаже по адресу: г. Минск, Игуменский тракт, 16-388, общей площадью 1100 кв. м. Назначение – Торговое помещение, с принадлежностью – электрощитовой площадью 15,8 кв. м, а именно: помещения цокольного этажа: №№ 388-1 – 388-12, лестничная клетка VIII, электрощитовая № 13, для осуществления розничной торговли и хранения товарно-материальных ценностей.

Арендная плата за помещения цокольного этажа в месяц составляет **1039,5 базовых арендных величин или 18 461,52 белорусских рублей**. Задаток по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества составляет **1 465,20 белорусских рублей**.

Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 2**. Часть изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-708179937, расположенного в подвальном помещении по адресу: г. Минск, Игуменский тракт, 16-388, общей площадью 1790,5 кв. м, а именно: помещения подвала – №№ 388-1 – 388-54, 388-56 – 388-62, 388-64 – 388-73, лестничная клетка VIII, для осуществления розничной торговли и хранения товарно-материальных ценностей.

Арендная плата за помещения подвала в месяц составляет **1692,0225 базовых арендных величин или 30 050,32 белорусских рублей**. Задаток по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества составляет **2 384,95 белорусских рублей**.

Шаг аукциона – 5 %.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

2. На Победителя аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Аренда».

**Аукцион состоится 24.09.2024 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

**Организатор аукциона:** РУП «Торговый дом «Восточный», 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14А.

Заявления на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, в рабочие дни: пн.–чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00.

**Окончание приема заявлений – 19.09.2024 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Объект №___, проводимом **24 сентября 2024 года**.

**Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона, о чем организатор аукциона обязан уведомить лиц, подавших заявления на участие в нем.**

**Контакты организатора аукциона:**
**+375 44 763 62 63; +375 17 275 75 12.**

Пасведчанне № 01-588 аб пастаноўцы на ўлік, выдадзенае пярвічнай арганізацыі дзяржаўнай установе дашкольнай адукацыі «Яслі-сад № 25 г. Баранавічы» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», **лічыць не сапраўдным у сувязі са стратай.**

Центр Промышленной Оценки

• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Двухкомнатная квартира** (**52,5 кв. м,** инв. № 122/D-6960, в состав квартиры входит кладовая в подвале). Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-23** | |
| **Начальная цена лота (без НДС) – 46 833,13 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **5 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона | |
| Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 22.08.2024 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 03.10.2024 в 11.00. Окончание торгов 03.10.2024 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.10.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов
**№ 2024.Ч.002.000102**
по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-55-08.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 01.10.2024 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-72512 площадью 2127 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 50/10, наименование – химсклад депо, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000172, площадью 6,4641 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 50 (общее долевое право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для строительства и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений.

**Нач. цена: 790 279,11 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 79 027,91 бел. руб.**

**Обременение**: договора аренды № 359д от 01.04.2022 действует по 31.01.2025, № 160д от 01.02.2017 действует по 31.01.2025, № 1д от 02.01.2019 действует по 31.12.2024.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** **до 16.00 30.09.2024.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить за предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: 8-0212-265383.

# Манга і маракуя на ўласных сотках

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Як вядома, навука бывае прыкладной — гэта значыць, вырашае надзённыя задачы сённяшняга дня, а бывае, што даследаванні адказваюць на гіпатэтычныя, «чыста навуковыя пытанні». Прымяненне гэтым даследаванням у рэальным сектары эканомікі адразу не знаходзіцца, але менавіта такая, накіраваная ў будучыню, навука часам дае штуршок да развіцця цэлага навуковага кірунку. Калісьці, гадоў 40 таму, вырошчваць на беларускай зямлі вінаград і кавуны, дыні і персікі спрабавалі толькі энтузіясты. Сёння гэтымі культурамі на асабістых сотках нікога не здзівіш. Зразумела, наўрад ці калі-небудзь беларускія садоўнікі будуць высаджваць каля дома манга (настолькі глабальнага пацяплення ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі і нават стагоддзі не прадбачыцца), але ў абароненым грунце цалкам рэальна вырошчваць шмат усяго, што не расце на нашых палях, усміхаецца суразмоўца.

## НЕ АЗІМЫЯ, А АЗІМІНА

Сёння ў цяпліцы Інстытута пладаводства «прапіску атрымалі» інжыр і маракуя, мушмула і хурма, гранат і — азіміна. Няхай сугучча са словам «зіма» і звыклым нам тэрмінам «азімыя», а таксама нейкае «роднае» гучанне слова не ўвядзе чытача ў зман:









— Азіміна — экзатычная расліна з Паўночнай Амерыкі, — тлумачыць Уладзімір Усцінаў. — Пакаштаваць гэты плод у нашых шыротах амаль немагчыма: ён не транспартабельны. Але па смаку азіміна адначасова нагадвае манга, ананас і клубніцы. А гэта мушмула, сёлета, напэўна, зможам пакаштаваць. А наступным летам, спадзяёмся, у нас запладаносіць ківі — вось ён расце. Пакратайце яго лісцікі: пухнатыя навобмацак, як і плод, — працягвае «экскурсію» для нас Уладзімір Мікалаевіч.

Ён расказвае, што сёння садоўнікі-аматары вырошчваюць на сваіх участках актынідыю. Яе называюць «беларускім ківі», паколькі гэтая ліяна з сямейства «Актынідыявыя», таго ж, да якога належыць ківі, здольна расці ў нашым клімаце. Ну, а тыя звыклыя для сучаснага спажыўца ківі, якія прадаюцца ў крамах, тэарэтычна можна вырошчваць у нашай кліматычнай зоне ў цяпліцы.

## ВЫРАСЦІЦЬ СВАЁ — ЗАЎСЁДЫ ЦІКАВЕЙ

Экзатычныя расліны трапічных краін супрацоўнікі Інстытута пладаводства імкнуцца адаптаваць да суровага для гэтых культур беларускага клімату.

— Вось расліны, якія мы высадзілі на пачатку вясны, — распавядае навуковец. — Бачыце, як за 4-5 месяцаў усё стартавала ў рост.

Але ж наперадзе — восень і зіма. Цяпліца не ацяпляльная, і дадатковага асвятлення для цеплалюбівых, святлолюбных экзатаў тут не прадугледжана, тлумачыць суразмоўца.

— Узімку расліны будуць знаходзіцца ў стане спакою, — кажа ён.

У многіх з гэтых раслін перыяду спакою на радзіме, у тропіках, няма, а некаторыя ўсё ж на зіму скідаюць лісце.

— Напрыклад, інжыр. Пасіфлору (яна ж маракуя) мы на зіму абрэжам і накрыем — у яе будзе змушаны супакой... А гэта манга, — паказвае Уладзімір Мікалаевіч на невялікі кусцік. — Пакуль не ведаем, што з яго вырошчвання атрымаецца.

Верхнія лісцікі ў манга падгарэлі на сонцы, але новыя растуць зялёнымі і на выгляд цалкам здаровымі: жыццёвая сіла расліны дапамагае ёй адаптавацца да складаных умоў. А вось інжыр пачуваецца на беларускай зямлі досыць утульна.

— Інжыр, як і вінаград, можна вырошчваць на шпалеры, ён, як і вінаград, добра размнажаецца чаранкамі, — тлумачыць навуковец.

Вінаград, некалі экзатычная для нас культура, — асноўная спецыялізацыя Уладзіміра Усцінава: па вырошчванні «сонечнай ягады» ён сёння ў нашай краіне — адзін з вядучых спецыялістаў і ў ліку самых вядомых экспертаў.

— Я з Віцебскай вобласці, палачанін. Будучы студэнтам першага курса Віцебскага ўніверсітэта, пазнаёміўся з Віктарам Паўлавічам Кухаравым, садоўнікам-практыкам, які стаяў каля вытокаў вырошчвання вінаграду ў Беларусі. Ён быў маім першым настаўнікам у вінаградарстве. Спачатку вырошчванне вінаграду было хобі, але ў 2002 годзе мяне запрасілі ў Інстытут пладаводства працаваць з гэтай культурай. Такім чынам, вінаградам я займаюся практычна ўсё жыццё.

Так што і з інжырам, шмат у чым падобным у агратэхніцы з вінаградам, Уладзімір Мікалаевіч здолеў «дамовіцца».

— Інжыр бывае розны: плады жоўтыя, фіялетавыя, карычневыя. Беларускаму спажыўцу больш звыклы фіялетавы інжыр: яго найчасцей прывозяць у нашы гандлёвыя сеткі з Ірана, Ізраіля. Мы пасадзілі ў сябе 24 сарты інжыра, каб паназіраць, як яны пакажуць сябе ў нашых умовах, у неацяпляльнай цяпліцы. Распрацоўваем агратэхніку, шукаем падыходы...

Пакуль што інжыр паказвае сябе няўдрэнна — у гэтым верасні нават ёсць саспелыя плады.

— Гэта сорт «Рандзіна», яго плады ўжо саспелі, каштуйце, — частуе нас навуковец.

У свежым выглядзе інжыр не надта салодкі, кажа ён. Салодкасць набываецца, калі плод высушваюць. У сушаным выглядзе ён і трапляе на прылаўкі магазінаў і рынкаў. Свежы інжыр у нашых гандлёвых сетках бывае рэдка.

— Дык чаму б не паспрабаваць вырасціць сваё? Сваё — заўсёды цікавейшае. Гэта першая спроба, — удакладняе суразмоўца. — Пакуль — чыста навуковы інтарэс. Бо хочацца паспрабаваць тое, чаго не рабіў раней. Тым больш што ў нашы дні з'явіліся новыя магчымасці, створаны сучасныя сарты, распрацаваны інтэнсіўныя тэхналогіі.

Плады маракуі знешне нагадваюць зялёныя тэнісныя мячыкі. Саспець яны павінны да канца кастрычніка. На маладым гранатавым дрэўцы завязалася сем гранатаў, ужо дастаткова буйных.

— Магчыма, з цягам часу сюды можна будзе вадзіць экскурсіі, — кажа Уладзімір Усцінаў. — Далёка не кожны мае магчымасць паехаць адпачываць кудысьці далёка, а тут людзі змогуць на свае вочы ўбачыць, як выглядае тая ці іншая пладовая экзатычная расліна.

## У ДАПАМОГУ ЭНТУЗІЯСТАМ

Відавочна, што мэты такога эксперымента не сельскагаспадарчыя: навукоўцы проста імкнуцца вывучыць віды і сарты экзатычных культур і па магчымасці адаптаваць іх да нашых кліматычных умоў. Зрэшты, практычная частка ёсць і ў гэтага навуковага праекта — рэкамендаваць найбольш удалыя з іх да вырошчвання прыватнікамі. Гэта, на думку спецыялістаў, можа прынесці карысць і аграрнай навуцы, і прыватнаму бізнесу, а значыць, у выніку і дзяржаве.

Зразумела, што праца гэтая нацэлена ніякім чынам не на колькі-небудзь буйныя вытворчасці: агракомплексам укладваць сілы і сродкі ў экзоты нявыгадна. У прынцыпе, сучасныя тэхналогіі дазваляюць прыстасаваць да нашых умоў многія экзатычныя культуры, але прывозіць іх адтуль, дзе яны растуць спрадвеку, прасцей і танней. Іншая справа — прыватнікі: дачнікі і маленькія фермерскія гаспадаркі. Невыпадкова ў энтузіястаў-садаводаў загараюцца вочы, калі яны бачаць насенне або саджанцы незвычайных культур або рэдкія сарты культур звыклых. Гэта на сезонных кірмашах у Інстытуце плодаагародніцтва селекцыянеры назіралі не раз.

Ну і навошта беларускаму садоўніку-аматару расціць манга ці маракую? — спытаеце вы. Таксама з «чыста навуковай цікавасці»? Чаму б і не? Акрамя таго, у гарачых краінах, дзе «ўсё расце само», гэтак жа прывольна адчуваюць сябе і хваробы раслін, і шкоднікі: каб атрымліваць высокія і стабільныя ўраджаі, даводзіцца праводзіць сур'ёзныя мерапрыемствы па абароне раслін. І гэтыя хімічныя апрацоўкі, зразумела, не робяць садавіну карыснейшай для здароўя. Акрамя таго, для падарожжа праз паўсвету плады даводзіцца здымаць з галінак недаспелымі, даспяваюць яны ў фурах, што таксама, пагадзіцеся, не дадае ім ні карыснасці, ні смаку. З гэтага пункту гледжання той жа «беларускі інжыр» атрымліваецца і чысцейшы, і смачнейшы — так што ў эксперымента, паўторымся, ёсць і практычны складнік.

Бо невыпадкова, як распавядаюць навукоўцы (а ім пра гэта распавялі фермеры), пакуль беларускія кавуны на рынках у сезон не прададуць, прывазныя людзі не купляюць. Таму што нашы «толькі з градкі» — зусім іншага смаку: у кавунах, якія сюды прывозяць здалёк, толькі 6 % цукру, а ў беларускіх — мінімум 8 %. Так, там больш сонца. Але каб прывезці кавун за сотні кіламетраў, яго рвуць недаспелым, для захавання ў дарозе апрацоўваюць фунгіцыдамі, якія змагаюцца з гнілямі, а такія саставы могуць быць небяспечныя для чалавека (штогод з'яўляюцца прыклады атручвання людзей такімі апрацаванымі кавунамі, набытымі на трасе). Сёння ў Беларусі кавунамі — таксама яшчэ нядаўна цалкам экзатычнай для нашых шырот культурай — займаюцца многія, і не толькі на поўдні краіны, але і ў Мінскай вобласці і нават на Віцебшчыне.

Тое ж самае датычыцца вінаграду, яшчэ адной у нядаўнім мінулым занадта цеплалюбівай для беларускага клімату культуры, якая сёння таксама вырошчваецца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Уладзімір Усцінаў расказаў, што расцяць яго фермеры пад Пінскам, Гомелем, Лідай, на Брэстчыне, ёсць вінаграднікі каля Салігорска, Слуцка, Капыля, пад Оршай і Магілёвам. Але каб пакаштаваць беларускі вінаград, трэба ехаць у сезон (гэта значыць, якраз цяпер) на мясцовыя рынкі. Да сталіцы гэты айчынны прадукт «даязджае» рэдка: з попытам на яго няма праблем і бліжэй да месца вырошчвання. Уся справа ў праславутай «экалагічнасці», а таксама ў тым, што айчынны вінаград «жывы»: знялі з лазы і максімум праз некалькі гадзін прапануюць пакупніку. Ну і плюс уладальнік невялікай фермерскай гаспадаркі можа дазволіць сабе пры выбары сартоў арыентавацца не на аб'ёмы, устойлівасць да хвароб, вонкавыя параметры і лёжкасць, а ў першую чаргу на смак.

Тых жа дачнікаў, якія жадаюць паспрабаваць вырасціць ва ўласнай цяпліцы экзоты, у нас дастаткова: гэтакі добры, карысны від славалюбства — жаданне парадаваць блізкіх і здзівіць суседзяў. І неўзабаве навукоўцы змогуць, так бы мовіць, на навуковай аснове парэкамендаваць энтузіястам і віды, і сарты, і агратэхніку. І нават прапанаваць насенне і саджанцы таго ж інжыра, граната, хурмы ці маракуі. Пакуль што садоўнікі-аматары часцей за ўсё выкарыстоўваюць насенне з пладоў, набытых у супермаркеце. Але ў гэтым выпадку вынік прадказаць немагчыма, бо часта плады такіх культур маюць гібрыднае паходжанне, а гэта значыць, іх насенне непрыдатнае да сяўбы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Уладзімір ШАНТАРОВІЧ:

# «Калі трэнер і спартсмен не могуць растлумачыць сваю перамогу — значыць, яны топчуцца на месцы»

## У чым рухальная сіла навукі перамагаць

**Нядаўна найстарэйшы трэнер зборнай па веславанні на байдарках і каноэ Уладзімір Шантаровіч заявіў, што веславанне сёння — спорт нумар адзін у краіне. Вядома, кожны спецыяліст вылучае свой від спорту. Але ў гэтым выпадку ўсё абсалютна аб'ектыўна. Ніводны від спорту ў апошнія месяцы не прынёс краіне столькі медалёў, як веславанне на байдарках і каноэ.**



Фота БелТА

Толькі лічбы. З чэмпіянату Еўропы нашы весляры прывезлі 11 медалёў. На Гульнях краін БРІКС беларусы заваявалі 16 залатых, 14 сярэбраных і 20 бронзавых медалёў. з Гульняў добрай волі прывезлі ажно 93 медалі! Нядаўні чэмпіянат свету прынёс беларусам 11 узнагарод. І гэта толькі самыя буйныя міжнародныя старты! Паміж імі былі і рэспубліканскія, і спаборніцтвы ў Расіі, сярод якіх і міжнародны камерцыйны турнір — Кубак братоў Агеевых. І ўсюды беларусы падымаліся на п'едэстал. На Алімпійскіх гульнях у Парыжы байдарачнік Уладзіслаў Кравец заняў чацвёртае месца ў фінале, а канаістка Юлія Трушкіна стала пятай. Уладзімір Шантаровіч часта паўтарае, што весляры павінны быць воінамі. І ў гэтым сезоне яны ўсім паказалі, што так і ёсць. Бо на кожным турніры трэба збіраць волю ў кулак і на кожны заезд выходзіць як на бітву. І перамагаць. На такое здольны толькі воіны. «Ёсць войскі, якія трэніруюцца на тры хвіліны бою — «Альфа». Дыстанцыю ў 1000 метраў весляр пераадольвае ў сярэднім за тры хвіліны, 500 метраў — і таго хутчэй. Мы як «альфаўцы», — сур'ёзна жартуе Уладзімір Шантаровіч. Вынікі сезона для вяслярных «альфаўцаў» найвопытнейшы трэнер зборнай па веславанні на байдарках і каноэ падвёў у інтэрв'ю «Звяздзе».

***— Практычна два гады весляры былі адхілены ад міжнародных стартаў. А, вярнуўшыся, зноў заняліся звыклай для сябе справай — сталі заваёўваць медалі. Уладзімір Уладзіміравіч, адкрыйце сакрэт, як рыхтаваць спартсменаў так, каб яны ў майстэрстве не гублялі, а толькі дадавалі?***

— Аналізаваць кожны пражыты дзень, тыдзень, месяц, год. Найлепшае кампанаваць. З памылак рабіць высновы і больш іх не дапускаць. У аснову ставіць планаванне. Калі проста так плыць па цячэнні, нічога не планаваць, то ў выніку нічога і не будзе. Сур'ёзных перспектыў і вынікаў без планавання не бывае — у любой справе. Трэнер павінен загадзя спланаваць і размеркаваць навучальны працэс. Мы пачынаем новы цыкл з разуменнем, што трэба рабіць, як трэба трэніравацца. Вынікі гэтага сезона сталі магчымыя, таму што запланаваная стратэгія дакладна выконвалася. Так, умовы былі вельмі няпростыя. Мы 120 дзён не выходзілі на ваду, працавалі толькі ў трэнажорнай зале. Для веславання гэта больш, чым форс-мажор. Усё-такі веславанне — летні від спорту, і трэніроўкі на вадзе неабходныя. Але не апускаць жа рукі. Рабілі акцэнт на сілавы кампанент, сышлі ў развіццё сілавой і функцыянальнай падрыхтоўкі — трэнажоры, спрынт. Без гэтага таксама немагчыма. Аналізавалі энергетычны кошт практыкаванняў, выкананыя аб'ёмы. Правільна арганізавалі працу, выйшлі на ваду і адразу прыйшлі ў прытомнасць. Але на гэта здольна толькі пэўная катэгорыя спартсменаў. Бо, як ні круці, а без спаборніцтваў вастрыня сапернiцтва страчваецца. Але прафесіяналы, воіны яе хутка вяртаюць. Тым больш міжнародная федэрацыя веславання нас допусціла на свае спаборніцтвы — паступова вяртаемся ў звыклую каляіну.

***— Атрымліваецца, зноў усё ўпіраецца ў навуку, аб чым вы часта нагадваеце?***

— Безумоўна. Адсочваць, кантраляваць, аналізаваць энергетычны кошт — гэта абавязковая частка падрыхтоўкі. На піку нагрузкі зрабіць забор крыві гэтак жа важна, як і размінка перад трэніроўкай. Нельга ўспрымаць навуку як дадатак да падрыхтоўкі спартсмена. Гэта аснова падрыхтоўкі. Кожную перамогу трэба вывучаць, аналізаваць і рабіць адпаведныя вывады. Калі трэнер і спартсмен не могуць растлумачыць сваю перамогу — значыць, яны топчуцца на месцы і расці не будуць. Ёсць такі крытэрый — энергетычны кошт — у яго трэба трапляць. І правільна аднаўляцца гэтак жа неабходна. Самае галоўнае — працаваць па плане і не адцягвацца ні на што іншае. Словаблудства расслабляе страшна. Так, навука ў нас — слабае месца. Але гэта не значыць, што мы павінны ад яе адмаўляцца. Яе неабходна прымяняць, прытрымлівацца выбранай стратэгіі і не адцягвацца на лішняе. Дакладны аналіз і выканальніцкая дысцыпліна — вось шлях да поспеху. На чэмпіянат свету, на Алімпійскія гульні наша каманда прыехала самая падрыхтаваная: тры дактары і тры масажысты. Яны працавалі суткі напралёт, аднаўлялі спартсменаў. Такімі сабранымі і сканцэнтраванымі нашых дактароў, як на гэтых Алімпійскіх гульнях, я не бачыў ніколі. Выступалі на арандаваных лодках, тэхнічныя спецыялісты рыхтавалі іх некалькі гадзін запар: шаравалі, клеілі, рыхтавалі да заездаў. Вытворчая дысцыпліна павінна выконвацца няўхільна. Вось гэта рухальная сіла навукі перамагаць.

***— Уладзімір Уладзіміравіч, якую адзнаку дасце гэтаму сезону?***

— Чатыры з плюсам па пяцібальнай шкале. Усё, што мы запланавалі, зрабілі. Так, 11 медалёў на чэмпіянаце свету — гэта нядрэнна. Але былі гады, калі мы прывозілі і па 14. Я заўсёды атрымліваю задавальненне, калі ў нас з'яўляюцца новыя чэмпіёны. У гэтым сезоне яны з'явіліся. Юлія Трушкіна і Іна Нядзелькіна сталі чэмпіёнкамі свету ў двойцы. Лена Наздрова стала чатырохразовай чэмпіёнкай свету, дадала медалі. Алег Юрэня, Мікіта Борыкаў у гэтым сезоне сталі двухразовымі чэмпіёнамі свету. Улад Кравец у гэтым сезоне праявіў сябе — стаў двухразовым чэмпіёнам Еўропы, чэмпіёнам свету, на Алімпійскіх гульнях заняў чацвёртае месца. Многія такі спіс дасягненняў пішуць некалькі гадоў, а ён за некалькі месяцаў справіўся. Менавіта гэта рухае наперад. Вось гэта мне прыносіць задавальненне і зараджае працаваць.

***— Якія перспектывы вы як трэнер бачыце перад Уладзіславам Краўцом?***

— Улад у гэтым сезоне перааделеў усе псіхалагічныя бар'еры. Спартыўна-псіхалагічная мабілізацыя ў яго на вельмі высокім узроўні. Яму не трэба асабліва настройвацца на старт — ён гатовы біцца. І гэта трэба ўмацоўваць і развіваць. Уладу, у прынцыпе, шмат над чым трэба папрацаваць. Але яму на руку тое, што ён вельмі збалансаваны спартсмен. Псіхалогія, фізіялогія — у яго ўсё збалансавана. У яго добры сілавы кампанент, мышачная маса, прырода надзяліла яго цягавітасцю. Ён умее чытаць дыстанцыю, лішніх рухаў сабе не дазваляе. Ёсць пачуццё вады, стратэгія праходжання дыстанцыі. У гэтым сезоне Улад даказаў, што ён воін. Пераключыцца з дыстанцыі на дыстанцыю з 500 на 5000 метраў для яго не праблема. Ён збалансаваны мнагаборац. І яго погляды на працу яму дапамагаюць. Яму ўласцівая імправізацыя і стратэгія праходжання дыстанцыі з арыентацыяй на сваё самаадчуванне. Ён не робіць толькі тое, што я яму сказаў, ён можа, арыентуючыся на сваё самаадчуванне, уносіць карэктывы. І мне падабаецца гэта імправізацыя. Значыць, спартсмен адчувае і аналізуе свой стан. Я тэарэтык, настаўнік, а на практыцы ўсё выконваць яму, і ён разумее, што яму трэба рабіць. Уладу ўжо трэба пачынаць зараджацца на наступную Алімпіяду, часу не так шмат, як здаецца.

***— Юлію Трушкіну вы называлі «ракетай». Як далёка паляціць гэтая «ракета», на ваш погляд?***

— Яна не толькі «ракета», але яшчэ і «альфавец» — хуткая, сабраная спартсменка. Але ёй трэба яшчэ вельмі шмат працаваць — над цягавітасцю, ёй трэба прарабіць велізарную кіслародную мышачную працу. У алімпійскім фінале ёй не хапіла сіл на апошнія 5-6 метраў, і гэта трэба выпраўляць, назапашваць сілы. Ёй усяго 21 год, але на наступнай Алімпіядзе будзе ўжо 25, а час пралятае вельмі хутка. Але мы ведаем, куды ісці і што рабіць. Галоўнае, каб ніякія вонкавыя фактары яе са шляху не збілі.

***— Уладзімір Уладзіміравіч, вы адзначалі, што стварыць экіпаж байдаркі-чацвёркі алімпійскага ўзору 2008 года для вас не праблема. Ці ёсць спартсмены, якія маглі б аб'яднацца ў гэты экіпаж?***

— Стварыць такі экіпаж сапраўды не праблема. Але давайце пачакаем. Перспектыўныя спартсмены ёсць, фарміруецца добры фон. І мы паспрабуем яго стварыць. Але аднаго экіпажа-чацвёркі вельмі мала. Каб веславанне развівалася і заставалася спортам нумар адзін у краіне, павінны працаваць рэгіёны, павінны варушыцца дзіцяча-юнацкія школы, вучылішчы алімпійскага рэзерву. Усе кажуць, маўляў, Гомельская вобласць — вяслярная Мекка. Але, дзеля справядлівасці, ужо і Гомельскай вобласці трэба дабаўляць у сваёй працы. Брэсцкая, Віцебская, Мінская вобласці не адстаюць і таксама імкнуцца ў лідары. Працы — непачаты край: удасканальваць селекцыю, падымаць студэнцкае веславанне, закладваць у спартсменаў тэхнічнае выкананне. І гэта ўсіх датычыцца. А для гэтага патрэбны спецыялісты, трэнеры высокага ўзроўню. Напрыклад, у Пінску, адкуль родам і Улад Кравец, і Дзіма Натынчык, зрабілі выдатную вяслярную базу, вельмі камфортная для трэніровак рака, але не хапае спецыялістаў. А ўмовы там усе ёсць. Так, я магу стварыць чацвёрку з членаў нацкаманды. Але падмурак тэхнікі, стратэгіі праходжання дыстанцыі, разумення веславання закладваецца ў ДЮСШ, у вучылішчы алімпійскага рэзерву. Спартсмены ў вучылішчы алімпійскага рэзерву не павінны канкурыраваць з членамі нацыянальнай каманды, гэта бессэнсоўна. У вучылішчы трэба рыхтаваць мнагаборцаў, закладваць у іх базу, фарміраваць характар воінаў. А з гэтым вельмі часта ўзнікаюць праблемы, і часам даводзіцца тлумачыць элементарныя рэчы. Як можа змагацца за медалі, біцца на спаборніцтвах спартсмен, які жыве і працуе толькі з фінансавых меркаванняў?! Ніяк, гэта ўтопія. Спартсмен павінен быць найперш патрыётам. Пра гэта таксама трэба казаць, на жаль, у нас не заўсёды гэта чуюць. І чым раней малады чалавек гэта зразумее, тым лепей для яго.

***— Для вас Алімпіяда ў Парыжы была «відушчай»?***

— У цэлым так. Я чытаў кожны заезд. Прайшлі папярэднія паўфіналы, я ўжо разумеў, дзе мы будзем. Чацвёртае месца Улада было прадказальнае, мы і разлічвалі на трэцюю—пятую пазіцыю. Ён мог бы прэтэндаваць на трэцяе месца, але ў фінале заехаў у корч і стаў чацвёртым. Сказаць, каб мяне нехта здзівіў, не магу. Чакаў большага ад кітайскіх весляроў, у іх два залатыя медалі, але я думаў, што будзе больш. Іх, дарэчы, наш Раман Петрушэнка трэніруе. Палякі расчаравалі. Адзначыў, што з'яўляюцца моцныя весляры з краін Лацінскай Амерыкі. У цэлым у спорце ідзе нармальны працэс: адбываецца змена пакаленняў, з'яўляюцца новыя імёны, адыходзяць старажылы.

***— Увесь гэты час, пакуль спартсмены адхілены, не цішэюць гутаркі, што трэба стварыць альтэрнатыўныя Алімпійскія гульні. Але вельмі складана замяніць спаборніцтвы, якія больш за сотню гадоў лічацца галоўнымі стартамі. Уладзімір Уладзіміравіч, улічваючы ваш жыццёвы і спартыўны досвед, як думаеце, ці змогуць нейкія спаборніцтвы замяніць Алімпійскія гульні?***

— Усё магчыма, калі моцна захацець. Але толькі ўявіце сабе, якая там павінна быць канкурэнцыя?! Возьмем, напрыклад, Гульні БРІКС: бліскуча арганізаваныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічалі спартсмены з наймацнейшых краін. Але на Алімпіядзе ўсё роўна была канкурэнцыя вышэйшая, таму што туды прыехалі наймацнейшыя спартсмены з усяго свету. Гульні БРІКС — цудоўныя спаборніцтвы, але гэта не альтэрнатыва Алімпіядзе. Так, алімпійскі рух сам сябе зжывае, бо ўмяшалася палітыка. Калі ўжо сам прэзідэнт МАК кажа, што які спорт без палітыкі, то пра што гаворка наогул! Адназначна трэба рабіць захады для рэанімавання алімпійскага руху, таму што палітыка яго знішчае. Але мне страшна ўявіць, якія гэта аб'ём працы, што закранае ўсе сферы. І для гэтага, вядома, патрэбен час. Таму сёння казаць аб тым, што будуць спаборніцтвы, якія заменяць Алімпійскія гульні, рана. Нам было вельмі складана гэтыя два гады працаваць. Не было дакладнага разумення, у якім мы становішчы, было вельмі шмат недаказанасцяў. Адным словам — ералаш. Потым крыху сітуацыя стабілізавалася, хлопцы выступалі на спаборніцтвах, імкнуліся паказваць свае найлепшыя вынікі. Але яны ўсе імкнуліся паехаць на Алімпійскія гульні, таму што на дадзены момант іх нічога не заменіць. Таму мы зараз крыху адпачнём і з пачатку кастрычніка вяртаемся да працы. Пачынаем новы алімпійскі цыкл.

Малыя адрасы вялікага спорту

Ігар РАБЧАНКА:

# «НА ТРЭНІРОЎКІ ПРЫХОДЗІЛІ ПА 80 ЧАЛАВЕК. КАЛЕГІ КАЗАЛІ: «КУДЫ СТОЛЬКІ НАБІРАЕШ?»

## Гісторыя магілёўскага гандбола з першых вуснаў

**Усе любяць спорт за спаборніцтвы, усе бачаць перамогі, часам паражэнні. Усе шануюць чэмпіёнаў. Але за іх спінамі стаяць людзі, якія кожны дзень робяць няхай і не заўсёды бачную, але надзвычай важную працу. Яны паказваюць шырокаму колу, што спорт можа прыносіць задавальненне кожнаму. Так, не ўсім наканавана стаць чэмпіёнамі, але ўмацаваць фізічную форму, атрымаць сваю дозу гармонаў шчасця ад практыкаванняў, на сабе адчуць усе тонкасці любімай гульні можа кожны. Людзі, якія робяць спорт масавым, прыцягваюць да яго ўвагу, выконваюць не менш важныя задачы, чым трэнеры прафесійных каманд. Ігар Карпавіч Рабчанка больш за 50 гадоў таму адкрыў для Магілёва гандбол. Ды і ўвесь айчынны гандбол развіваўся на яго вачах, таму яго можна цалкам апраўдана лічыць не толькі бацькам магілёўскага гандбола, але і энцыклапедыяй беларускага ручнога мяча.**



Гандбол (разам з іншымі гульнявымі відамі) як прафесійны спорт сфарміраваўся ў ВНУ. Не дзіва, дзе яшчэ знойдзецца мноства актыўных, моцных маладых людзей, чыю энергію трэба накіраваць у карыснае рэчышча. Гандбольнымі першапраходцамі ў 1960-я гады сталі Інстытут фізічнай культуры і Беларускі політэхнічны інстытут. Але рэгіёны не адставалі ад сталіцы. У 1961-м па размеркаванні ў Магілёў прыехаў малады спецыяліст Ігар Рабчанка, апантаны спортам.



**Эфектыўнасць працы выкладчыка — дасягненні яго вучняў. І ў тых, з кім працаваў Ігар Рабчанка, яны неверагодныя. З яго лёгкай рукі з гандболам пазнаёміўся і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

### «Інтарэс да гандбола быў шалёны. Трэніраваліся да ночы»

«У мой час дзеці займаліся ўсімі даступнымі ім відамі спорту. Я з дзяцінства і лёгкай атлетыкай займаўся, і на лыжах хадзіў, футбол, баскетбол у двары — гэта нават не абмяркоўвалася. Для паступлення на факультэт фізпадрыхтоўкі Гомельскага інстытута трэба было здаваць тры спецпрадметы: лёгкая атлетыка, гімнастыка і плаванне. З гэтымі відамі я быў на «ты», таму паступіў нават пры вялізным конкурсе. На першым курсе займаўся баскетболам. А затым адкрыў для сябе гандбол. Ён быў зусім не такі, як цяпер. Мы гулялі ў гандбол 11 на 11. Матчы праходзілі на футбольным полі — пляцоўка вялікая, людзей шмат. Сучасны 7 на 7 мне імпануе больш: там усё выконваецца тэхнічна хутчэй і гледачам цікавей. Гандбол мне спадабаўся адразу, і гульня адразу пайшла. Кідок у мяне быў прыстойны — узялі на чэмпіянат рэспублікі ў Мінск. Так і замацаваўся на пазіцыі правага паўсярэдняга. А пасля заканчэння вучобы мяне хацелі пакінуць на родным факультэце, але ў Магілёўскім педінстытуце быў патрэбны гульнявік, і я па размеркаванні паехаў у Магілёў», — успамінае Ігар Карпавіч.

Пра гандбол у Магілёве ў той час яшчэ ніхто не чуў. У пачатку 1960-х ён толькі заваёўваў папулярнасць у Беларусі. Магілёўскую моладзь невядомы від спорту не напужаў, а, наадварот, зацікавіў. Прычым зацікавіў няслаба. Як адзначае Ігар Рабчанка, адбою ад ахвотных пазнаёміцца з гэтай гульнёй не было. А з адкрыццём у 1962 годзе абласной дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы з аддзяленнем гандбола ў горадзе на Дняпры пачалося сур'ёзнае развіццё ручнога мяча. Гандболам займаліся і хлопчыкі, і дзяўчынкі. Па словах Ігара Карпавіча, на рэспубліканскіх спаборніцтвах школьнікаў магілёўскія каманды пастаянна былі ў прызах. А каманда Магілёўскага педінстытута пад яго кіраўніцтвам на турнірах саступала толькі інстытуту фізкультуры і Палітэхніку. «Інтарэс да гандбола быў шалёны, па 80—90 чалавек прыходзілі запісвацца ў секцыі. Многія, канешне, адсейваліся, але спартсменаў заставалася нямала. Сучасныя трэнеры могуць толькі пазайздросціць таму, што праблем з наборам не было ніякіх. Праўда, пляцовак у нас не было зусім. Спартыўных залаў на ўвесь горад таксама было няшмат. Трэніраваліся пераважна на вуліцы. Калі на металургічным заводзе адкрылі новую спартыўную залу, гэта было шчасце. Але не бясхмарнае. Студэнтам і школьнікам гэтая зала была даступная з 22 гадзін вечара да апоўначы. Ад цэнтра горада да завода паўтара — два кіламетры. Пехам ісці — каля гадзіны. Але ж хадзілі! Па 30—40 студэнтаў кожны вечар прыходзілі на трэніроўку. Некаторыя калегі нават мне казалі: «Куды ты столькі набіраеш?» Але калі малады чалавек хоча займацца, я ж не магу адмовіць. Так і трэніраваліся да ночы. З гэтых начных трэніровак да зборнай СССР дайшоў Павел Куяўскі, адзін з найлепшых лінейных 1970-х гадоў. Нямала здольных гандбалістаў вырасла падчас трэніровак да ночы.

### «Гандбаліст быў выдатны: напорысты, падрыхтаваны»

Эфектыўнасць працы выкладчыка — дасягненні яго вучняў. І ў тых, з кім працаваў Ігар Рабчанка, яны неверагодныя. З яго лёгкай рукі з гандболам пазнаёміўся і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, у тыя гады студэнт гістарычнага факультэта Магілёўска педінстытута. «У новай спартыўнай зале на вуліцы Касманаўтаў па раскладзе мае трэніроўкі стаялі пасля заняткаў гістарычнага факультэта. І заканчваліся іх заняткі футболам. А што хлопцам?! Разгуляюцца так, што не спыніць, а ўжо мой час наступае. І студэнт Аляксандр Лукашэнка пастаянна прасіў яшчэ 5—10 хвілін ім даць. Тады я прапанаваў яму заставацца на маю трэніроўку і гуляць на здароўе. Ён пагадзіўся. Гандбаліст быў выдатны: па-добраму нахабны на пляцоўцы, напорысты, мяч нікому не аддаваў, сапернікам не даваў расслабляцца і тэхнічна падрыхтаваны да гульні. На першынстве інстытута адзін выцягваў каманду гістарычнага факультэта. Я нават прапаноўваў яму сур'ёзна заняцца гандболам: у яго і характар, і фізічная падрыхтоўка для гандбола былі выдатныя. Але будучы Прэзідэнт зрабіў выбар на карысць футбола», — расказвае эксклюзіўныя факты Ігар Карпавіч.

Старшыня Беларускай федэрацыі гандбола Уладзімір Канаплёў і сёння з павагай успамінае свайго трэнера і спаборніцтвы паміж факультэтамі: «Дзякуючы Ігару Карпавічу гандбол у Магілёўскім педінстытуце быў папулярнай гульнёй, і каманды ў нас былі вельмі моцныя. Як правіла, у фінал чэмпіянату Магілёўскага педінстытута выходзілі каманды геафака і гістфака. За геафак гуляў я, а за гістфак — Аляксандр Лукашэнка. І мы ўвесь час прайгравалі гістфаку 1-2 мячы. Хлопцы нават жартавалі, што гэта таму, што Ігар Карпавіч выкладае на гістфаку. Але калі сур'ёзна, то ўсё было вытлумачальна. З геафака сур'ёзна гандболам займаліся некалькі чалавек, астатнія хлопцы проста гулялі для сябе. А вось інстытуцкая зборная, якую трэніраваў Ігар Карпавіч, была дастаткова моцнай. Мы рэгулярна прыязджалі на спаборніцтвы ў Мінск, гулялі супраць моцнага «Палітэха».

«Валодзя Канаплёў быў на пляцоўцы прыкметнай фігурай. Кідалася ў вочы яго мэтанакіраванасць і няўступлівасць. Відаць было, што хлопец з характарам», — такім цяперашняга кіраўніка айчыннага гандбола памятае Ігар Рабчанка. Праз яго рукі прайшоў і алімпійскі чэмпіён 1988 года, а сёння галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Юрый Шаўцоў. «Юра — настырны хлопец. І гэта гулец, які ўмее думаць на пляцоўцы. Сур'ёзных памылак не дапускаў, бо заўсёды меў галаву на плячах, што дазваляла яму выходзіць нават з самых складаных становішчаў. Юра ляўша, што таксама яму, у прамым сэнсе гэтага слова, на руку, для гандбола гэта вялікая перавага», — расказвае Ігар Карпавіч. Ён, як ніхто іншы, разумее, у чым сакрэт поспеху яго вучняў. «Любы чалавек нараджаецца для пэўнай справы, для пэўнага віду спорту. І калі ён знаходзіць сваё — значыць, яму пашанцавала, менавіта ў гэтай сферы ён лепш за іншых раскрые свае здольнасці. Але гэтага недастаткова. Трэба працаваць. Заўсёды, кожны дзень трэба працаваць», — разважае ён.

### Трэба звярнуць увагу на рэгіёны

Ігар Рабчанка стаў адным з першых трэнераў у жыцці Юрыя Шаўцова. А потым Віктар Касінскі забраў яго ў спартыўны інтэрнат (сёння вядомы як рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву). Па словах Ігара Рабчанкі, дзякуючы працы Віктара Пятровіча Касінскага, які не стамляўся ездзіць па Беларусі ў пошуках таленавітых гульцоў, сталі магчымыя поспехі беларускага гандбола савецкага часу. Алімпійскія перамогі пачынаюцца з падрыхтоўкі рэзерву, а сёння гэта вялікая праблема для многіх відаў спорту. «На мой погляд, трэба больш увагі ўдзяляць рэгіёнам. Раней ніякіх праблем не было, каб забраць у спартыўны інтэрнат спартсмена з любога рэгіёна. А зборныя каманды рэспублікі на 70 працэнтаў складаліся з рабят з абласных цэнтраў. Паміж спартсменамі была добрая, карысная канкурэнцыя. Кожны імкнуўся трапіць у спартыўны інтэрнат, а пасля і ў найлепшыя каманды ці нават зборныя. Так спорт і развіваўся», — разважае Ігар Карпавіч.

Спецыяліст перакананы: рыхтаваць спартсмена трэба з дзяцінства. І прыводзіць як добры прыклад спаборніцтвы паміж дзіцяча-юнацкімі школамі, дзе трэнеры могуць заўважыць перспектыўных дзяцей. Чым раней, тым лепш. Выхаваць добрага спартсмена з чалавека, якому 18 гадоў, амаль немагчыма, адзначае Ігар Карпавіч. Многія для сябе спорт і фізкультуру адкрываюць толькі ва ўніверсітэтах. Таму, па словах Ігара Рабчанкі, студэнцкі спорт найперш аматарскі. Але і яго нельга абмінаць увагай — тут і аздараўленне моладзі, і папулярызацыя здаровага ладу жыцця, і прыцягненне ўвагі да спорту. «З развіццём ДЮСШ, адкрыццём новых спартыўных аб'ектаў відавочна, што ўзровень нашага гандбола павінен расці. Але ў той жа час падае цікавасць маладых людзей да яго. І гэта сумна. На жаль, студэнты з кожным годам менш адказна ставяцца да трэніровак. Я сумняваюся, што цяпер нехта трэніраваўся б да гадзіны ночы... І адказным за спорт трэба зрабіць немагчымае, каб выправіць сітуацыю. За гандбол я спакойны, бачу, як працуе Валодзя Канаплёў і федэрацыя», — адзначае ён.

### Радавацца трэба жыццю

У Магілёўскім педагагічным інстытуце Ігар Рабчанка працаваў да 2017-га, стаж — 55 гадоў. Чалавек, які ўсё жыццё правёў сярод моладзі, застаецца маладым і ў 86 гадоў. І сакрэту маладосці не ўтойвае: «Раніцай — паўтары гадзіны зарадкі. Затым выходжу ў лесапаркавую зону на прабежку. Там ёсць трэнажоры — качаю брушны пояс і прэс. Абавязкова падцягваюся — разоў 15. І радавацца трэба жыццю. У мяне яно склалася: быў добрым выкладчыкам, не апошнім спартсменам. Сям'ю стварыў, дзве дачкі, унукі. Што яшчэ трэба?»

Але ж Ігар Карпавіч і хварэе... Хварэе толькі за прыгожы гандбол.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з архіва героя.**
*Магілёў.*

Сведения о результатах проведения Рекламной игры

# «ЛЕТНИЕ ПЛАНЫ – ЯРКИЕ ПРИЗЫ!»

**Сведения об организаторе:**

Общество с ограниченной ответственностью «ПРАЙМЭРИ» с местонахождением по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.

**Наименование Рекламной игры:**

«Летние планы – яркие призы!»

**Срок начала и окончания Рекламной игры:**

Срок начала Рекламной игры – 01 августа 2024 года;

Срок окончания Рекламной игры – 09 октября 2024 года.

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 16 июля 2024 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4447.

**Сведения о количестве участников Рекламной игры:**

В Рекламной игре приняло участие 10 719 человек.

**Сведения о розыгрыше призового фонда:**

Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

**Сведения о победителях и их выигрышах:**

По одному Еженедельному призу 1, включающему в себя **Электросамокат My Way X5 (графитовый)**, стоимостью 1 089,996 белорусских рублей, а также денежные средства **в размере 131,79 белорусских рублей**, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Матюта С.С. |
| 2 | Абрамович В.А. |
| 3 | Киринович В.И. |
| 4 | Корогода М.Р. |

По одному Еженедельному призу 2, включающему в себя **Портативную колонку JBL Flip 6 (Серый)**, страна производитель Китай, стоимостью 408,995 белорусских рублей, а также **денежные средства в размере 30,03 белорусских рубля**, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Михайловский А.В. |
| 2 | Карачун А.С. |
| 3 | Бараташевич Л.С. |
| 4 | Казак О.Н. |

По одному Еженедельному призу 3, включающему в себя **Фотоаппарат с мгновенной печатью Fujifilm Instax Mini 12 (белый)**, страна производитель Китай, стоимостью 414,995 белорусских рублей, а также **денежные средства в размере 30,93 белорусских рублей**, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Губицкая В.В. |
| 2 | Прокопович Ж.В. |
| 3 | Минова М.В. |
| 4 | Бакланенко Н.В. |

По одному Еженедельному призу 4, включающему в себя **Походный набор Helios HS-425S-4BG (синий/серый)**, страна производитель Россия, стоимостью 201,215 белорусских рублей, выиграли:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Василенко М.Б. |
| 2 | Диль С.А. |
| 3 | Захаревич Д.Л. |
| 4 | Горбач Т.Е. |

По одному Еженедельному призу 5, включающему в себя **Чемодан на колесах Bugatti Kallisto / 49709101 (черный)**, страна производитель Турция, стоимостью 439,068 белорусских рублей, а также денежные средства **в размере 34,53 белорусских рубля**, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Ларюшина В.В. |
| 2 | Гаврош Д.Ю. |
| 3 | Бохан Н.К. |
| 4 | Ходосовский Н.О. |

Главный приз, включающий в себя **Денежные средства в сумме 30 000,00 (тридцать тысяч) белорусских рублей**, а также **денежные средства в размере 4 451,68 белорусских рублей**, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграл следующий участник:

| № п/п | ФИО Победителя |
|---|---|
| 1 | Чумаков В.В. |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры** +375 33 660 36 36.

Телефон Организатора Рекламной игры по вопросам, связанным с выдачей призов (выигрышей), +375 25 503 47 41.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **Дзержинского филиала**
**Минского областного потребительского общества**
(продавец) проводит открытый аукцион

## по продаже здания магазина № 159

**с инв. № 620/С-46449, общей площадью 112,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622285501601000362 площадью 0,0763 га** *(право аренды по 11.05.2122)*, **по адресу: Минская область, Дзержинский район, Фанипольский с/с, аг. Гричино, ул. Луговая, 96.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **42 303,90** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 230,00** бел. руб.

Объект обременен договором аренды (по 31.12.2025) (дополнительные сведения у организатора аукциона).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.10.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.10.2024** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801716) 9-96-53, (8029) 578-35-46.**

УНП 600037767

Пасведчанне № 01-593 аб пастаноўцы на ўлік, выдадзенае пярвічнай арганізацыі дзяржаўнай установы дашкольнай адукацыі «Яслі-сад № 43 г. Баранавічы» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», **лічыць не сапраўдным у сувязі са стратай.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1: Легковой седан МАЗДА 6, год выпуска 2003 г., кузов № JMZGG123231150134, регистрационный знак 1084 АВ-1**

| Начальная цена, руб. (без НДС) | 2 981,58 | Размер задатка, руб. | 298,16 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** государственное учреждение «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», 224001, г. Брест, ул. Северная, 13/1, тел./факс 80162542059. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 сентября 2024 г. до 17.00.**

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

### 1) Здание цеха по производству клеевой ленты и объекты благоустройства

**в г. Волковыске, ул. Новопроектная, 1В.**

Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

### 2) Здание главного корпуса, будка с колодцем, овощехранилище с составными частями

**в г. Волковыске, ул. Госпитальная, 11/15, 11/16, 11/1.**

Начальная цена предмета аукциона – 3 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**Аукцион состоится 08.10.2024 в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **02.10.2024 до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;
в городе Гродно 8 (0152) 62 39 24, 62 39 32, 62 39 23.
Дополнительная информация размещена на сайте **https://au.nca.by**

УНП 500042135

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 8 октября 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Ивана Осинного, 32 У-705, микрорайон «Заболоть» 440100000002007120** | 0,1142 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, надземных этажей: 1; площадь застройки 168 кв. м, готовность 34 %. Фундамент железобетонный, наружные, внутренние стены: блоки газосиликатные; перегородки: блоки газосиликатные, кирпичи; смотровая яма, крыльцо. Погреб 3,48х1,05, площадь 4 кв. м; стены, перекрытие: бетон | 382,44 | 61 135,49 (29 045,29; 32 090,20) | 12 000 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок.

Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 8 октября 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 16 сентября по 2 октября 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Экалагічная бяспека

# НА ДЗЕНЬ БЕЗ УЛАСНАГА АЎТО

## Падчас «Тыдня мабільнасці» беларусаў запрашаюць перасесці на веласіпеды

**«Тыдзень мабільнасці» пройдзе ў Беларусі з 16 да 22 верасня. Мэта акцыі — нагадаць, як важна скарачаць выкіды ў атмасферу, большая частка якіх паступае ад аўтамабіляў. У гэтыя дні прапануецца зрабіць выбар на карысць альтэрнатыўных спосабаў перамяшчэння — грамадскага транспарту і сродкаў мабільнасці (веласіпедаў, самакатаў, манаколаў, сегвэяў). Найбольш маштабныя мерапрыемствы пройдуць у сталіцы, якая па зразумелых прычынах з'яўляецца лідарам па колькасці аўтатранспарту і, адпаведна, выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу.**

### ЛІДАР ПА ВЫКІДАХ У АТМАСФЕРУ — АЎТАМАБІЛІ

— Усё, што робіцца на гэтым тыдні, павінна нагадаць пра негатыўны ўплыў аўтамабіляў на навакольнае асяроддзе і падштурхнуць жыхароў сталіцы і рэгіёнаў для выкарыстання альтэрнатыўных спосабаў перамяшчэння. Найлепшы спосаб адзначыць «Дзень без аўтамабіля» — не карыстацца ім, — адзначае **старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валянцін ШАТРАЎКА.**

Традыцыйна ў дзень акцыі ўсе, хто адмовіўся ад паездак на ўласным аўто, атрымліваюць права на бясплатны праезд у гарадскім грамадскім транспарце. Летась у рамках экалагічнай акцыі гэтай магчымасцю скарысталіся 12 462 чалавекі, у 2022-м — 15 484 (падлік правялі ў сталічным метрапалітэне). Сёлета Мінскі гарадскі савет дэпутатаў прыняў рашэнне, што 22 верасня падчас акцыі «Дзень без аўтамабіля» «Мінсктранс» і Мінскі метрапалітэн таксама будуць даваць права бясплатнага праезду асобам пры прад'яўленні пасведчання кіроўцы і пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку.

**«Згодна са статыстычнымі данымі, у сталіцы 80 % выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу прыпадае на аўтамабілі і толькі 20 % — на прамысловыя прадпрыемствы».**

Дарэчы, згодна з данымі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у дні правядзення акцыі выкіды забруджвальных рэчываў у атмасферу па краіне змяншаюцца на 100—200 тон. Заўважны эфект назіраецца і ў сталіцы. У рамках правядзення «Тыдня мабільнасці» ў Мінску пачынаючы з 2016 года 21—22 верасня праводзіцца эксперымент па вымярэнні асноўных забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры на перакрыжаванні вуліц Я. Коласа — Кульман, у парку адпачынку імя Горкага, зоне рэкрэацыі «Парк камянёў». Вынікі паказваюць, што выкіды ў гэтыя дні змяншаюцца ў 1,2—1,3 раза.

— Мінск адчувае істотную нагрузку ад выкідаў аўтатранспарту, маючы пры гэтым даволі развітую сетку грамадскага транспарту. Трэба адзначыць, што, згодна са статыстычнымі данымі, у сталіцы 80 % выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу прыпадае на аўтамабілі і толькі 20 % — на прамысловыя прадпрыемствы. Пра гэта сведчаць і звесткі з аўтаматычных станцый бесперапыннага рэжыму вымярэння стану забруджвання атмасфернага паветра. Канцэнтрацыя аксідаў азоту і вугляроду вышэйшая ў гадзіны пік: раніцай з 7 да 9 гадзін і ўвечары з 17 да 19 гадзін, што звязана з інтэнсіўнасцю руху аўтатранспарту, — звярнуў увагу Валянцін Шатраўка.

Зрэшты, нягледзячы на тое, што асноўнай крыніцай забруджання атмасфернага паветра горада з'яўляецца транспарт, назіраецца станоўчая тэндэнцыя па зніжэнні выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу ад мабільных крыніц. Па даных справаздач, у Мінску ў 2022 годзе яны склалі 73,4 тысячы тон, у 2023-м — на 2 тысячы тон менш (71,4 тысячы тон).



### ЗНІЖКІ І БЯСПЛАТНАЯ САДАВІНА

Сёлета з 16 да 22 верасня ў сталіцы будуць праходзіць мерапрыемствы, прысвечаныя «Тыдню мабільнасці», а таксама гарадской экалагічнай акцыі «Дзень без аўтамабіля. Беларусь за чыстае паветра». 21—22 верасня будзе праведзены традыцыйны эксперымент па вымярэнні канцэнтрацыі забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры. Ва ўстановах адукацыі пройдуць інфармацыйныя гадзіны, прысвечаныя экалагічнай акцыі. У гандлёвым цэнтры «Сталіца» з 11 да 22 верасня ладзіцца выстаўка «Гісторыя электратранспарту».

Мерапрыемствы запланаваны ва ўсіх раёнах сталіцы. Традыцыйна будзе арганізавана акцыя «На работу — на веласіпедзе» з бясплатнай раздачай фруктаў. Яна пройдзе ў чатырох пунктах горада: каля ўвахода ў Цэнтральны батанічны сад, каля «Мінск-арэны» на баку веладарожкі (пр. Пераможцаў, 111), на вуліцы Прытыцкага (каля будынкаў №№ 27—29), побач са шматузроўневым паркінгам (пр. Дзяржынскага, 13). А 22 верасня ўсе ахвотныя атрымаюць зніжку на арэнду шэрынгавых веласіпедаў і электрасамакатаў Eleven і Whoosh.

22 верасня ў парку імя Уга Чавеса з 13 да 20 гадзін пройдуць забаўляльныя мерапрыемствы, у тым ліку канцэртная праграма. Жыхарам і гасцям сталіцы прапануюць наведаць выстаўку электратранспарту, навучаць кіраваць электрасамакатам, ездзіць на манаколе, можна будзе набыць экатавары і экапрадукты. Сваю работу прадэманструюць адукацыйныя праекты, будзе працаваць кантактны заапарк, можна будзе навучыцца фігурнаму кіраванню веласіпедам, паўдзельнічаць у віктарынах і квэстах. У 20 гадзін завершыць мерапрыемства заезд падсвечаных экалагічных відаў транспарту па маршруце вул. Каменнагорская — Казіміраўская — Люцынская — Каленікава.

— Наша задача — заахвоціць насельніцтва карыстацца веласіпедамі і іншымі відамі мабільнага транспарту не толькі ў «Тыдзень мабільнасці». Для гэтага службы Мінска ўсё робяць для камфортных умоў. Вядзецца работа па стварэнні новых участкаў веладарожак, ствараецца сістэма захоўвання веласіпедаў па ўсім Мінску. Распрацаваны велапешаходныя турыстычныя маршруты, якія ёсць у кожным раёне Мінска, іх агульная працягласць складае каля 70 км. Напярэдадні заканчэння велаcіпеднага сезона будуць праводзіцца заключныя мерапрыемствы: 21 верасня каля Нацыянальнай бібліятэкі з 11 гадзін — «Першы веласіпед» — спартыўна-масавае мерапрыемства для дзяцей і падлеткаў з цікавай забаўляльнай праграмай, — расказала **прадстаўнік Галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Дар'я ШЫБІНСКАЯ.**

### ГОРАД ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ, А НЕ ДЛЯ МАШЫН

З улікам павелічэння электрасамакатаў і веласіпедаў мяняецца і гарадское асяроддзе. У прыватнасці, сёлета выканана 111 паніжэнняў бартавога каменя на перакрыжаванні веладарожак з праезнай часткай, а таксама амаль 13 тысяч кв. м пакрыццяў тратуараў было адрамантавана і адаптавана для веласіпеднага руху. Як паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Арцём ГАНЧАР,** усяго на 2024 год запланавана 215 паніжэнняў і амаль 23 тысячы кв. м рамонту тратуараў. На сёння больш за 50 % работ выканана, і яны працягваюцца. Праўда, падчас «Тыдня мабільнасці» колькасць рамонтнай тэхнікі, задзейнічанай на дарогах, зменшыцца.

Свой унёсак у экалагічную бяспеку Мінска робіць і «Мінсктранс» як адзін з найбуйнейшых перавозчыкаў. Доля электрыфікаванага транспарту на прадпрыемстве ўжо складае больш за 46 %. Гэта каля 700 тралейбусаў, больш за 100 трамваяў, 93 электробусы, якія абслугоўваюць восем былых аўтобусных маршрутаў. Да канца бягучага года, як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Раман ПРАНОВІЧ,** плануецца атрымаць яшчэ 10 электробусаў, 20 трамваяў, 50 тралейбусаў. З 17 верасня прадпрыемства запрашае школьнікаў у Музей гарадскога пасажырскага транспарту (пр. Партызанскі, 6) на квэсты і экскурсіі.

Не застанецца ўбаку ў дні экалагічнай акцыі і Дзяржаўтаінспекцыя. З 16 да 22 верасня пройдзе «Тыдзень дарожнай бяспекі», падчас якога супрацоўнікі ДАІ правядуць сацыяльны раўт, накіраваны на папярэджанне ДТЗ з удзелам веласіпедыстаў і карыстальнікаў сродкаў персанальнай мабільнасці. Акрамя таго, супрацоўнікі ДАІ будуць несці службу на аварыйнанебяспечных участках дарог і нерэгуляваных пешаходных пераходах. Асаблівая ўвага будзе скіравана на прафілактычную работу з грамадзянамі і папулярызацыю выкарыстання святлоадбівальных элементаў. А 20 верасня ў Мінску пройдзе масавы велапрабег з удзелам супрацоўнікаў ДАІ, а таксама прадстаўнікоў каманд юных інспектараў дарожнага руху ўстаноў адукацыі Мінска.

### КІРОЎЦА ЦІ ПЕШАХОД? ЗГАДВАЕМ ПРАВІЛЫ

Аддаючы перавагу сродкам індывідуальнай мабільнасці, варта памятаць і асноўныя правілы карыстання імі. Пра іх нагадаў **Сяргей ГАНЧАРОЎ, старшы інспектар Упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама.** Найперш важна памятаць, што карыстальнікі сродкаў персанальнай мабільнасці адносяцца да пешаходаў. Рухаючыся пры недастатковай асветленасці і ў цёмны час сутак, пешаход павінен абазначыць сябе святлоадбівальным элементам, а на сродках персанальнай мабільнасці павінна быць уключана фара ці ліхтар. Пры руху на такім устройстве для ўласнай бяспекі рэкамендуецца выкарыстоўваць ахоўны шлем. Карыстальнікі сродкаў персанальнай мабільнасці могуць рухацца па веласіпедных дарожках, пры іх адсутнасці — па тратуарах, пешаходных дарожках і абочынах, не ствараючы перашкод для пешаходаў. Падчас перасячэння праезнай часткі дарогі на сродках персанальнай мабільнасці неабходна рухацца па веласіпедным пераездзе з захаваннем патрабаванняў ПДР. Пры адсутнасці веласіпеднага пераезду — у месцах, прадугледжаных для пешаходаў. Ехаць трэба з хуткасцю пешахода, не ствараючы перашкод для руху. Таксама важна пераканацца, што выезд на праезную частку бяспечны.

**«Усё, што робіцца на гэтым тыдні, павінна нагадаць пра негатыўны ўплыў аўтамабіляў на навакольнае асяроддзе і падштурхнуць жыхароў сталіцы і рэгіёнаў для выкарыстання альтэрнатыўных спосабаў перамяшчэння».**

На сродках персанальнай мабільнасці забаронена рухацца з хуткасцю, большай за 25 км/г, а таксама карыстацца імі ў стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення, перавозіць пасажыраў без спецыяльна абсталяваных месцаў для сядзення, не трымацца за руль пры яго наяўнасці. Акрамя таго, ездзіць на такіх устройствах забараняецца дзецям да 14 гадоў — акрамя пешаходных і жылых зон.

Рухаючыся на веласіпедзе ў цёмны час сутак, трэба ўключыць фару ці ліхтар (з белым святлом спераду і чырвоным святлом — ззаду). Веласіпедыст абавязаны перасякаць праезную частку дарог па веласіпедным пераездзе ці веласіпеднай дарожцы, а пры іх адсутнасці — па пешаходным пераходзе. Пры перасячэнні праезнай часткі дарог веласіпедыст управе не спешвацца, але павінен загадзя знізіць хуткасць і, пераканаўшыся, што выезд на дарогу бяспечны, перасякаць яе з хуткасцю пешахода.

Веласіпедысту забараняецца выкарыстоўваць тэхнічна несправныя веласіпеды, рухацца не трымаючыся за руль, перавозіць пасажыраў (за выключэннем дзяцей да сямі гадоў на дадатковa спецыяльна абсталяваных сядзеннях). Кіраваць веласіпедам не могуць дзеці да 14 гадоў на ўсіх дарогах, акрамя пешаходных і жылых зон, тратуараў і веласепедна-пешаходных дарожак.

**Алена КРАВЕЦ.**

Канстанцін МІХАЛЕНКА:

# «НАША ЗАДАЧА — ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БАЛАНС ФІНАНСАВЫ І ТВОРЧЫ»

**Чарговы тэатральны сезон Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр пачаў разам з новым мастацкім кіраўніком. Гэта той варыянт, калі новы — гэта добра вядомы свой: яшчэ некалькі гадоў таму Канстанцін Міхаленка выходзіў на сцэну як артыст і захапляў публіку. За час работы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў здолеў стварыць паспяховы вучэбны тэатр. Але вяртанне ў Маладзёжны — і ўжо не ў якасці артыста — адбываецца ў той час, калі калектыў на нейкі час апынуўся без творчага кіраўніцтва і шукае арыенціры існавання ў новых умовах, якія неўзабаве чакаюць тэатр. Пра гэта і пайшла наша размова:**

— У нас ёсць план — пэўная колькасць спектакляў у год, ёсць план па гледачы, план па выручцы, якую мы павінны прыносіць, план па гастролях па Беларусі. Самае галоўнае — гэта, вядома, фінансаванне, бо цяпер тэатр не проста атрымлівае датацыю, а павінен і сам зарабляць. І мы павінны быць гатовыя да работы ў новых фінансавых умовах (спачатку 60 на 40 працэнтаў, далей 50 на 50). Таму мы не маем права на памылку, — лічыць **Канстанцін МІХАЛЕНКА.** — У Маладзёжным тэатры ёсць мастацкі савет, які ўхваляе п'есы да пастаноўкі, а потым прымае гатовыя спектаклі, ён рэкамендуе нешта дапрацоўваць ужо па ходзе. Але ўсё ж лепш добра падумаць, перш чым нешта ставіць. У тым ліку і пра тое, як рацыянальна мы можам выкарыстоўваць сродкі, што ў нас будуць.

На цяперашні момант у нас больш за 40 спектакляў, яны розныя ўзроўню. Але гэта вялікая нагрузка на акцёраў, якія трымаюць іх у актыве. Праца артыстаў у нас ацэньваецца баламі (у залежнасці ад колькасці выхадаў, нагрузкі, ступені аддачы і г. д). Праўда, ёсць дыспрапорцыя: у кагосьці з акцёраў за месяц 200 балаў, а ў кагосьці значна менш, а гэта ўплывае на заробак. У кагосьці на стаўку мала працы, і чалавек шукае, дзе яшчэ можна падзарабіць. Трэба думаць, як заняць людзей больш у родным тэатры. Калектыў у нас добры, але мая задача як мастацкага кіраўніка — мінімізаваць розніцу паміж, умоўна кажучы, «багатымі» і «беднымі», паміж больш загружанымі і тымі, хто заняты менш.

***— Маладзёжны тэатр пасля рамонту пераехаў у велізарны будынак, які павінен забяспечвацца вызначанай колькасцю персаналу. Якія суадносіны творчай і тэхнічнай часткі?***

— Так, у тэатры павінны быць інжынеры, людзі, якія забяспечваюць на сцэне гук, святло, прыбіральшчыцы памяшканняў, ёсць сталярная майстэрня, рэквізіт, касцюмерны цэх, што праце на патрэбы творчай часткі. У нас, лічу, адна з найлепшых пляцовак у Мінску: на якое б месца ў глядзельнай зале вы ні селі, добра бачыце, што адбываецца на сцэне. Выдатная акустыка, святло, зручныя грымёркі, добрыя ўмовы для артыстаў. У тэатры цудоўная камінная зала, дзе глядачы пастаянна ладзяць фотасесіі, ёсць буфет. Нам грэх скардзіцца. Пытанні, звязаныя з рознымі службамі, стараемся закрываць у залежнасці ад узроўню задач, якія трэба вырашаць, і заробкаў, якія мы можам прапанаваць. Ёсць людзі ідэйныя, якія нават на невялікі заробак будуць добра рабіць сваю працу, а ёсць спецыялісты, якія гатовы бездакорна выконваць усё, што ад іх патрабуюць, але за пэўны заробак, а гэта эканоміка тэатра.

Нам трэба эканамічныя складнік падцягнуць так, каб пры гэтым не пацярпеў творчы. Таму што часта бывае так, што «хітамі» з добрымі касавымі зборамі могуць аказацца спектаклі, ніжэйшыя за сярэдні ўзровень. Калі ісці за гледачом і ставіць такія спектаклі, то можна трапіць у своеасаблівую пастку: паставім нешта сур'ёзнае — а публіка нас можа не зразумець. Мы страцім гледача, адпаведна, і грошы. Таму неабходны баланс у рэпертуары. Гэта і для артыстаў важна, бо яны павінны развівацца, а гэта значыць, іграць разнапланавыя ролі, у розных жанрах.

Сваю задачу найперш бачу ў тым, каб прапаноўваць сур'ёзныя пастаноўкі на высокім мастацкім узроўні. Упэўнены, што і глядач ацэніць якасць. Калі Марку Захараву задалі пытанне: «Як вы разумееце, што спектакль паспяховы?» — ён адказаў: «Калі ў зале роўная колькасць мужчын і жанчын». Беларуская статыстыка сведчыць пра тое, што ў тэатры цяпер больш ходзяць жанчыны...

***— Калі ў тэатра вялікі рэпертуар, то якія суадносіны за год прэм'ер і спектакляў, якія могуць адысці ў мінулае?***

— Калі спектаклі якасныя, калі яны карыстаюцца попытам у гледача, то тэатр можа і не захабляваць новымі назвамі. Ведаю, што ёсць забароненыя прыёмы: калі стары спектакль застаецца, але мяняецца назва. Гэта не наш шлях. Скажу больш: мы зацікаўлены ў тым, каб кожны рэжысёр, калі прыходзіць да нас (расійскі ці беларускі), разумеў, што ён ставіць спектакль толькі для Маладзёжнага тэатра Беларусі, і іншага такога ў яго пастаноўцы не будзе нідзе. Напрыклад, рэжысёр паставіў спектакль у горадзе N. У яго ўжо ёсць музыка, ёсць кампазітар, сцэнограф, касцюмы — поўны пакет. І з гэтым пакетам ён прапаноўвае пастаноўку, бярэцца за паўтара месяца яе зрабіць. І ў афішы з'яўляецца новая назва... А потым мы едзем на гастролі, і аказваецца, што ў гэтым горадзе ёсць такі спектакль у той жа рэжысуры. І што рабіць?.. Як мастацкаму кіраўніку, які выбудоўвае рэпертуарную палітыку, мне цікава, каб у нас быў эксклюзіўны прадукт. Мне не хочацца, каб у нас у спектаклі гучала музыка, якая гучыць яшчэ ў 30 гарадах Расіі. Але хочацца, каб была арыгінальная рэжысура і іншыя творчыя складнікі. Можна ісці па шляху найменшага супраціву, але гэта не вельмі цікава.

Тэатр не прыгавораны да вялікай колькасці пастановак, можна ў год і адну ажыццявіць (калі трупа занята і спектакль з'яўляецца яркай творчай падзеяй). Нейкія спектаклі сыдуць у гісторыю з-за таго, што занадта доўга жывуць і вычарпалі свой глядацкі рэсурс, нейкія — з эканамічных меркаванняў. Мы не абавязаны закідваць гледача новымі назвамі, а будзем рабіць упор на якасны і эксклюзіўны прадукт, зроблены менавіта для Маладзёжнага тэатра.

Задача ў тым, каб гэтыя новыя пастаноўкі сталі прынадай для пашырэння кантынгенту гледачоў. І мастацка-адукацыйны складнік таксама важны, каб прывучаць публіку да спектакляў неантрэпрызнага характару.

***— Ці магчымы нейкі падыход да рэжысуры з пункту гледжання інавацый, эксперыментаў?***



— Улетку на базе Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра праходзіла рэжысёрская лабараторыя — сумесны праект з Саюзам тэатральных дзеячаў Расіі. За тыдзень былі падрыхтаваны тры разнапланавыя рэжысёрскія работы. Тры розныя п'есы, тры рэжысёры працавалі з нашымі артыстамі. Па выніках лабараторыі мы адабралі варыянт, які стане паўнавартасным спектаклем на сцэне нашага тэатра. Пастаноўка плануецца ўжо на 2025 год. Мы хацелі б, каб рэжысёрская лабараторыя праходзіла ў нас кожны год. Бо ёсць перыяды, калі тэатр працуе, але патэнцыяльныя гледачы заняты зямнымі клопатамі, у літаральным сэнсе — агародамі, дачамі (напрыклад, у маі). Мы маглі б у гэты час працаваць у іншым фармаце, але таксама на будучыню тэатра. Канешне, трэба распрацаваць дакументацыю, весці адбор п'ес і заявак, якія дасылаюць маладыя рэжысёры. Але мы можам атрымаць варыянты, з якіх нешта выбіраць і далей працаваць. Артысты таксама зацікаўлены: рэжысёры прыходзяць збоку, працуюць з трупай з чыстага ліста, выбіраюць тых, хто ім падыходзіць па тыпажы. Артыст заняты — адчувае сябе больш упэўнена ва ўсіх сэнсах. Мікраклімат у калектыве паляпшаецца і г. д. Гэта адзін з каналаў, дзякуючы якому мы можам атрымаць свежы малады рэжысёрскі погляд. Мы не прыхільнікі эпатажу дзеля эпатажу, таму што вельмі часта за ім губляецца і сэнс, і рэжысура як такая. Мы вельмі спакойна ставімся да розных форм: гэта могуць быць фантасмагорыі, мюзіклы, дэтэктывы ці неверагоднае змешванне жанраў. Але калі будзе добрая ідэя, не менш добрае ўвасабленне, мы толькі вітаем.

***— У штаце тэатра ёсць рэжысёры, ёсць і акцёры, якія таксама жадаюць ставіць. Ці збіраецеся прыцягваць да супрацы кагосьці збоку?***

— Я буду думаць аб тым, каб максімальна заняць нашага мастака, нашага рэжысёра. Калі ў рэжысёра ў плане спектакль ці два за год, то ён павінен іх паставіць. Калі ёсць план у мастака — ён па ім працуе. Усе пажаданні звыш таго — як атрымаецца. Тое ж і з артыстамі. Лепш абыходзіцца ўласнымі сіламі. А што да пастаноўкі спектакляў артыстамі, то ёсць шмат прыкладаў, калі нараджаліся шэдэўры. Напрыклад, Марк Захараў — першапачаткова акцёр, але стаў яркім рэжысёрам.

У верасні ў нас чатыры прэм'еры, якія былі выпушчаны летам, перад самым сыходам у адпачынак. Дзякуючы ім атрымаўся актыўны пачатак сезона ў Маладзёжным тэатры: на вялікай сцэне спектакль па п'есе Міхаіла Хейфеца «Рок-н-рол на змярканні» ў пастаноўцы Таццяны Аксёнкінай з выдатным акцёрскім ансамблем, на малой сцэне — харэаграфічны спектакль «Шынель» паводле Мікалая Гогаля ў пастаноўцы Кірыла Балтрукова, спектакль паводле п'есы Ксеніі Шталянковай «Тут была Клара» Таццяны Аксёнкінай. І ўжо на пачатку сезона адбылася прэм'ера спектакля «Ідыёты» (паводле твора Фрэдэрыка Бакмана «Трывожныя людзі») якраз у пастаноўцы акцёра Анатоля Лагуценкава, гэта яго рэжысёрскі дэбют, і занятая вялікая частка трупы. Праз спектаклі мы імкнёмся разумець, як здзіўляць гледача. У нас ёсць, напрыклад, інтэрактыўны спектакль для дзяцей «Гісторыя фарфоравага труса» ў пастаноўцы Аляксея Шутава, таксама нашага акцёра. Вось два прыклады, калі артысты спрабуюць нешта рабіць і, мне падаецца, у іх гэта нядрэнна атрымліваецца. Але ёсць нюанс: калі акцёры пачынаюць шукаць выйсце для сваёй творчай энергіі, то гэта для кіраўніцтва нагода задумацца, чаму так адбываецца. Чаму раптам узнікла гэта п'еса? Чаму сталі рэпеціраваць? Чаму?..

Як нованароджаны мастацкі кіраўнік я вымушаны ў гэтым разабрацца, і ў іншых пытаннях, з якімі раней не сутыкаўся. Імкнуся больш часу і сіл аддаваць гэтай працы, адмаўляюся ад уласнай творчасці, бо доўгі час працаваў тут як акцёр і як рэжысёр таксама ставіў спектаклі. Але наўмысна забараняю сабе вяртацца ў акцёрскую прафесію менавіта дзеля таго, каб больш эфектыўна працаваць на новай пасадзе.

***— У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вы ж атрымалі спецыяльнасць рэжысёра?***

— Так, па спецыяльнасці я рэжысёр. І ёсць спектаклі, якія, мусіць, можна было б паставіць. Думаю, што не своечасова, бо трэба паглыбіцца не толькі ў творчыя пытанні, але і адміністрацыйныя, гаспадарчыя, каб наша вялікая і малая сцэны былі загружаны больш эфектыўна.

Ёсць, напрыклад, розныя графікі па хуткасці мантажу спектакляў. Трэба зразумець: а ці можам мы раніцай іграць казкі, а ўвечары — спектакль? Якія спектаклі найбольш зручна стыкуюцца? Гэта так ці інакш злучана з творчасцю. Бо калі мы максімальна загружаем пляцоўкі, разводзім артыстаў, каб яны не перасякаліся, але ў той жа час былі больш занятыя, у іх, адпаведна, большы заробак. А калі я пачынаю рэжысіраваць (што, можа, і хацеў бы рабіць), то маю ўвагу паглынае ўласны спектакль...

***— У Маладзёжнага склаўся імідж тэатра, куды прыходзяць адпачываць, — у афішы шмат камедый, лёгкіх спектакляў...***

— Камедыя, напэўна, самы папулярны жанр: лірычная камедыя, камедыя становішчаў, музычная камедыя... У нас нават быў спектакль, дзе ў назве гэта пазначана: «Чэхаў. Камедыя. Чайка». Гэта жанр, без якога тэатр не можа існаваць. Таму што чалавеку трэба элементарна разняволіцца. У нас ёсць нядрэнныя сур'ёзныя спектаклі, але, бывае, глядач прыходзіць, бачыць частку дэкарацый і ўздыхае: «Лепш бы я пайшоў у лазню!» — я яго разумею. Калі ў кагосьці ў жыцці ўсё ў парадку і браку драматызму, тады хочацца і паперажываць, і паплакаць. А ў некага хапае праблем, а тут яшчэ праз спектакль дадаюць, тым больш у выхадны дзень, калі жонка ўгаварыла пайсці ў тэатр (дзякуй, што буфет ёсць!)... Таму камедыя — самы запатрабаваны жанр. Іншая справа, што забаўляць можа не толькі камедыя. Возьмем, напрыклад, дарагога Уільяма нашага Шэкспіра. Калі напісаць на афішы «Гамлет», камедыя» — гэта ўжо інтрыга: хіба ж гэта не трагедыя? Можна нават і паставіць як камедыю. Але такія пярэкруты (іх шмат на Захадзе і на Усходзе) мне не вельмі падабаюцца. Гэта спектакль-атракцыён, які не прадугледжвае ніякай ідэі. А ў добрай камедыі, як правіла, глыбокі сэнс, згадайце класіку: «З каго смеяцеся? З сябе смяяцеся». Ці для цябе становіцца смешным тое, што здавалася страшным ці з'яўлялася перашкодай чыста з псіхалагічнага пункта гледжання. Камедыі могуць дапамагчы чалавеку разабрацца ў сабе — калі паглядзець на рэчы з боку і пад іншым ракурсам. На мой погляд, камедыя павінна быць з сэнсам і трагедыя павінна быць са святлом, каб не ператварыцца ў нейкую чарнуху. Я за тое, каб несці надзею, я за святло, за тыя каштоўнасці, якія абазначаны ў хрысціянскай культуры.

Вельмі часта ўзрушваюць простыя рэчы. У нас быў спектакль «Варшаўская мелодыя», ён быў зроблены вельмі проста, але да гэтага часу гледачы пра яго пытаюць, хоць апошні раз яго ігралі пяць гадоў таму. Ён кранаў больш, чым некаторыя спектаклі, на якія патрачаны вялікія грошы...

***— Апошнія некалькі гадоў у Маладзёжнага былі няпростыя з розных прычын. Ці ёсць задачы, якія патрабуюць прынцыповага вырашэння?***

— Ёсць моманты, якія трэба вырашаць прынцыпова. Ёсць спектаклі, мастацкая каштоўнасць якіх выклікае сумневы. Вядома, яны паступова сыдуць у цень. Але ў нас вельмі добрая акцёрская трупа. Хачу нагадаць, што яна здолела працаваць нават у самыя цяжкія часы, калі «маладзёжка» стала на рамонт, калі мы аказаліся без мастацкага кіраўніка, не ведалі, што будзе далей. Менавіта тады стаў больш важкім голас мастацкага савета на чале з тагачасным дырэктарам Віктарам Старавойтавым. Як ні дзіўна, у перыяд рамонту мы не толькі не страцілі, а нават дадалі сабе плюсаў. У стрэсавых сітуацыях выяўляецца і творчае майстэрства, і найлепшыя чалавечыя якасці. Спадзяюся, што самы складаны час для нашага тэатра ў мінулым. Так, мы бачым свае недахопы і працуем над тым, каб іх выправіць.

***— Наколькі важнае ўзаемаразуменне мастацкага кіраўніцтва і адміністрацыйнага, бо задачы могуць быць супрацьлеглыя?***

— Так, вельмі важна. Напрыклад, у нас ёсць спектаклі, за якія мы выплачваем да 20 % аўтарскіх ад выручкі. Я лічу — і ў гэтым згодны з дырэктарам Марынай Дзяркач, — што гэта немэтазгодна. Для артыстаў гэта можа быць няважна, бо яны гатовы працаваць, калі з'явілася добрая п'еса, добры рэжысёр, кампазітар. Але кіраўніцтва пачынае разбірацца: а колькі аўтарскіх давядзецца выплаціць? А калі гэта замежная п'еса, то які працэнт перакладчыку, колькі рэжысёру, кампазітару?.. А калі зала не прададзена? У нас жа ёсць план па выручцы. І тады ўключаецца кіраўнічы рэсурс, калі мы звязваемся, сустракаемся, дамаўляемся, магчыма, на іншых умовах, шукаем варыянты, пры якіх выгадна было б супрацоўнічаць і аўтару, і тэатру. Артыст не абавязаны ў гэта паглыбляцца. Артыст хоча іграць, артыст хоча выходзіць на публіку. А наша задача — забяспечыць баланс фінансавы і творчы, каб п'есы добрыя ставіліся і тэатр не сыходзіў у страту.

***— Ці ёсць думкі звярнуцца да беларускай драматургіі?***

— У нашым рэпертуары ёсць некалькі спектакляў паводле сучаснай беларускай драматургіі — паводле Улады Альхоўскай і Ксеніі Шталянковай. А калісьці быў выдатны спектакль у пастаноўцы Мадэста Абрамава «Несцерка». Музычны, з добрым акцёрскім ансамблем, меў вялікі поспех. Не думаю, што яго можна аднавіць: час змяніўся, хуткасці змяніліся, аранжыроўкі ўжо іншыя патрабуюцца, іншае харэаграфічнае вырашэнне. Але я хацеў бы, каб беларуская драматургія ў нас з'яўлялася, як і пастаноўкі на беларускай мове. Ведаю гэты рэпертуарны недахоп заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. У нас багатая драматургія, частка якой ужо стала нацыянальным здабыткам. У гэтым кірунку таксама будзем шукаць і абмяркоўваць варыянты з мастацкім саветам.

***— Ці можа трупа ўплываць на нейкія рашэнні?***

— Калі б я быў акцёрам, то сказаў бы: вядома, трупа павінна ўплываць на прыняцце рашэнняў — акцёры ж выходзяць на сцэну. Калі ты становішся кіраўніком і атрымліваеш больш інфармацыі, то адказ ужо не такі адназначны. Мне хацелася б, каб у «маладзёжцы» была сітуацыя ўзаемная. Як за згінанне і разгінанне рукі ў чалавека адказваюць дзве мышцы — біцэпс і трыцэпс. Але як чалавек, адказны за мастацкае кіраўніцтва, рашэнні буду прымаць я. Спачатку пастараюся сабраць інфармацыю з розных крыніц — акцёрскіх, мастацка-пастановачных, службаў продажу квіткоў і гэтак далей, — і прыму рашэнне з улікам усіх пажаданняў, пярэчанняў, праклёнаў, бласлаўленняў, якія ўвесь час, напэўна, будуць сыпацца на маю галаву...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Бібліятэка — не проста дом для кніг

**У нядзелю, 15 верасня, у нашай краіне ўжо па добрай традыцыі будзе адзначацца Дзень бібліятэк. Менавіта ў гэты дзень па Указе Прэзідэнта краіны ў 2001 годзе пачала функцыянаваць Нацыянальная бібліятэка Беларусі. І напярэдадні свята якраз у найбуйнейшым кнігасховішчы і адбылася сустрэча журналістаў са спецыялістамі культурнай установы. Абмеркавалі многія пытанні, прычым не толькі найбліжэйшай перспектывы, але і глабальнага развіцця.**



Аднак пра ўсё па парадку. Што да святкавання Дня бібліятэк, то ўжо 12 верасня ў «дыяменце ведаў» прайшоў конкурс «Найлепшыя па прафесіі», дзе вызначылі найлепшых супрацоўнікаў за апошні год. А 13 верасня шэраг важных і актуальных тэм абмеркавалі на Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі «Сучасны стан публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь», да ўдзелу ў якой былі запрошаны калегі-бібліятэкары з розных устаноў краіны.

— Нацыянальная бібліятэка Беларусі даўно выйшла за межы проста бібліятэкі, яна стала сацыякультурнай установай, дзе праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы. У нас шмат наведвальнікаў, якія прыходзяць з вялікім задавальненнем не толькі пачытаць кнігі, але і наведаць выставы, паўдзельнічаць у прэзентацыі кніг. Напрыклад, нядаўна мы праводзілі Бібліятэчны баль. І будзем працягваць гэтую традыцыю. Ужо паступіла шмат заявак на Каляндны баль, — адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па ідэалогіі, сацыякультурнай і выдавецкай дзейнасці НББ Людміла ВЫСОЦКАЯ.** — Таксама будзем працягваць нашы міжнародныя кантакты. Таму што пасольствы розных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь праяўляюць ініцыятыву і прыходзяць да нас ужо з прэзентацыямі сваіх выданняў. Добра ідзе ў нас справа і з выдавецкім кірункам. Як і з фізкультурна-аздараўленчым. Бібліятэка развіваецца па ўсіх кірунках. І гэта вельмі важна як для нас, так і для насельніцтва горада і ўсёй краіны. Мы для ўсіх заўсёды адкрытыя.

Спецыяліст таксама распавяла, што ў планах культурнай установы адкрыццё выставак «Аўтографы Прэзідэнту» і «Да 85-годдзя ўз'яднання Беларусі». Акрамя гэтага, варта чакаць адкрыцця асветніцкага дзіцячага і падлеткавага кніжнага цэнтра. Такая пляцоўка дазволіць ладзіць мерапрыемствы менавіта для юнай аўдыторыі. А ў перспектыве ўжо адбудзецца адкрыццё Кніжнага цэнтра Саюзнай дзяржавы і Цэнтра духоўнай кнігі.

Вядомая Нацыянальная бібліятэка і сваімі багатымі кніжнымі фондамі. На сёння іх лічба сягае 10,5 мільёна розных відаў дакументаў, дзе і кнігі, і дысертацыі, і ноты і інш. Па словах **намесніка генеральнага дырэктара НББ Віктара ПШЫБЫТКІ,** у фондах захоўваецца інфармацыя на больш чым 80 мовах свету:

— Наша бібліятэка валодае і найбуйнейшым у краіне фондам старадрукаваных выданняў, дзе больш за 100 тысяч дакументаў. У фондзе ў нас захоўваецца таксама калекцыя рукапісаў, дзе больш за 2000 адзінак. Калі спыняцца на найбольш каштоўных, то такія рукапісы датуюцца XIV стагоддзем. Напрыклад, у калекцыі ўсходніх рукапісаў у нас прадстаўлена 34 манускрыпты. Найбольш старажытным беларускім рукапісным помнікам з'яўляецца Мінея — кніга для богаслужэнняў XV стагоддзя. І таксама адзін з самых старажытных і вядомых беларускіх рукапісаў, якія ёсць у нашых фондах, — «Таемнае таемных», ён датуецца XV — пачаткам XVI стагоддзя. Захоўваюцца і дзесяць экзэмпляраў Бібліі Францыска Скарыны, — распавёў Віктар Вікенцьевіч. — Можна знайсці ў фондах і прыжыццёвыя выданні беларускіх класікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і іншых. Вядома, Нацыянальная бібліятэка — гэта не толькі фонды друкаваных дакументаў. Сёння мы прадстаўляем доступ да больш чым 70 баз даных. Таму нашы карыстальнікі маюць выбар: альбо прыйсці ў бібліятэку і чытаць друкаваныя кнігі, альбо папрацаваць з электронным дакументам. І, як паказваюць нашы даследаванні, абодва варыянты запатрабаваны. Проста больш сталае пакаленне абірае друкаваную кнігу, а маладыя — электронны варыянт.

Спыніўся суразмоўнік на пытанні лічбавізацыі, якое стаіць для галіны востра:

— У гэтым кірунку мы таксама вельмі актыўна працуем. Ужо практычна ўсе абласныя бібліятэкі пачалі алічбоўку сваіх фондаў. НББ таксама займаецца алічбоўкай, і наш электронны фонд на сёння складае больш за 700 тысяч дакументаў. Сімвалічна і тое, што ў Год якасці мы рэалізавалі праект па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы электронных бібліятэк Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Яго мы рэалізоўваем у некалькі этапаў. На першым у анлайн-прасторы прадстаўлены доступ да кніг, дысертацый — да больш за 150 тысяч дакументаў. Да Дня бібліятэк забяспечым такі доступ ва ўсіх абласных бібліятэках краіны. І наша мэта — каб усе жыхары краіны атрымалі роўныя ўмовы доступу да фондаў і рэсурсаў электроннай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

А вось яго калега **намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуцы і інфармацыйных тэхналогіях НББ Аляксандр БАБУК** падзяліўся некаторымі данымі сацыялагічнага даследавання, мэтай якога было высветліць, ці чытаюць сёння беларусы, што выбіраюць і ў якім фармаце. Паводле яго слоў, сапраўды нашы людзі сталі чытаць менш, як і скарацілася колькасць наведвальнікаў бібліятэк. Аднак калі казаць пра ўпадабанні чытачоў, то тут у лідарах Уладзімір Караткевіч, а на другім месцы — Васіль Быкаў. Большасць беларусаў выбірае ўсё ж мастацкую літаратуру, а ўжо потым — навукова-папулярную і вучэбную. Прычым 82 % аддаюць перавагу друкаванаму носьбіту. І, што даволі цікава, большасць апытаных кіруецца ў тым ліку тым, якія выданні выбіралі бацькі. Таму ёсць спадзяванне, што калі дзіця бачыць сваіх бацькоў з кнігай у руках, то яно калісьці возьме яе ў рукі.

**Алена ДРАПКО,**
**фота аўтара.**

# КІНО З МАШТАБАМ...

**Днямі ў сталічным кінатэатры «Беларусь» прайшоў прэс-паказ адной з доўгачаканых прэм'ер бягучага года — фільма «Чорны замак». Кінастужка, створаная па матывах рамана Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі», з'явілася як вынік супрацоўніцтва Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» і расійскай кампаніі «Нью Арт Сінема Пракдакшн».**



У пракаце ўбачым кінаработу толькі ў снежні, таму пакуль што толькі крыху прыадкрыем таямніцу, што чакае нас на вялікім экране. Па сюжэце назіраем, як настаўнік гісторыі Антон Косміч шукае адказы на загадкі мінулага і доказы таго, што ён не вінаваты ў смерці свайго сябра Пташынскага, разам з якім яны выпадкова знайшлі старажытны шыфр, схаваны кімсьці ў тэксце старога Евангелля... Рэжысёрам-пастаноўшчыкам новай кінастужкі выступіў Кірыл Кузін (Расія), а аўтарам сцэнарыя і прадзюсарам — Глеб Шпрыгаў (Беларусь). Кінатворцы на пачатку паказу адзначылі, што работа над «Чорным замкам» для іх была вялікай адказнасцю і разам з тым няпростай задачай. Хацелі зрабіць фільм у жанры «вялікага кіно».

— Не глядзіце гэты фільм як нешта, знятае па кнізе ці параўноўваючы з кінастужкай, якую знялі некалі нашмат раней, глядзіце проста як кіно. Усе, хто працаваў над яго стварэннем, стараліся. Яны, бывала, траплялі ў вельмі складаныя ўмовы існавання на здымках, бо маштаб, які вы ўбачыце на экране, толькі да пэўнага часу быў акцёрам пад сілу, — прыадкрыў закуліссе работы над «Чорным замкам» рэжысёр Кірыл Кузін. — І вялікі дзякуй усёй здымачнай групе: мастакам, аператарам, акцёрам, мастакам па касцюмах, каскадзёрам і іншым! Вамі зроблена вялікая праца. Тыя ж артысты масавых сцэн, бывала, біліся ў 30-градусную спякоту і нават не задумваліся, што пасля хтосьці можа дрэнна сябе адчуваць. Усе без выключэння стараліся, таму проста глядзіце кіно. Спадзяёмся, яно ў нас атрымалася.

А маем мы цяпер фільм на аматара. Найперш ён зацікавіць усіх прыхільнікаў творчасці беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча. Можа спадабацца і такой катэгорыі гледачоў, якія любяць дэтэктывы, вайну ў кадры і назіраць за тым, як добрыя хлопцы змагаюцца з дрэннымі за справядлівасць. Дарэчы, з ліку такіх дрэнных якраз Лыганоўскі — апошні нашчадак князя Альшанскага, якога на экране ўвасабляе расійскі акцёр Яўген Стычкін. Герой трымаецца ў сюжэце добра, праўда, неяк з самай першай сцэны яго з'яўлення адчуваеш, што ён не проста так дапамагае... А пасля ўвогуле ў ім з'яўляецца інфернальны складнік. Роля Антона Косміча (і па сумяшчальніцтве прататыпа з мінулага адважнага шляхціца Валюжыніча) дасталася таксама расіяніну, Яўгену Шварцу. З беларусаў толькі Анастасію Красоўскую (Гардзіслава), Аляксандра Душачкіна (Лапатуха), Аляксандра Гіранка (Клепча) і Сяргея Белякова (Жыховіч) мы можам убачыць у карціне.

— Усё, што мы, артысты, робім, робім для гледача. І ўся здымачная група фільма паставілася з вялікай адказнасцю і да самога твора, і да работы з рэжысёрам і аўтарам сцэнарыя. Усе акцёры, задзейнічаныя ў гэтай кінастужцы, працавалі ў поўную сілу. Таму што гэта аповед не пра нашых сучаснікаў, а пра гістарычных асоб, якіх многія ведаюць са школьнай праграмы, — адзначыў народны артыст Расійскай Федэрацыі, выканаўца ролі суддзі Станкевіча Віктар Вяржбіцкі. — Мы ўсе з розных акцёрскіх школ, аднак, лічу, рэжысёру ўдалося аб'яднаць нас у адзіны ансамбль, і мы здолелі паглыбіцца ў тую эпоху, і стараліся максімальна раскрыць сваіх персанажаў.

